Zajazd pisarsko-teatralny, rodem z mojej utopii, stworzyłam przeciw patologicznemu klimatowi, ściskającemu pisarza jak w kleszczach mafii. Bez „jak" fragment zdania powtórzę: w kleszczach mafii. Klimat ten obecny jest w amerykańskim filmie „Blef" Hallstroma. Wydawca szuka niewiadomo czego, „książki takiej, że aż". Pisarz staje się antypatycznym pajacem, przestępcą, a wszystko dla raptem dwóch rzeczy, sławy i pieniędzy, a ta książki, która będzie „taka, że aż", to już pozostaje na marginesie tych dwóch żądz. Wymyśla autobiografię multimilionera, rzekomo na jego życzenie. Doi kasę od wydawcy. Fałszuje listy od multimilionera i fałszuje czeki. Kradnie cudzy maszynopis, aby dokonać ordynarnej zrzyny czy też żywego plagiatu. I tak dalej. Gdzie tu czas na pisanie w tym krętactwie?! Nie ma, więc trzeba kraść cudzy maszynopis. W końcu krętacz ląduje za kratami. Nie z powodu zrzyny jednak. Multimiliarder wścieka się z powodu tej mistyfikacji, dokonanej na nim. Głupieje żona pisarza, odbierając fałszywy czek na milion dolarów. Przebiera się, wkłada perukę.

Ta przerażająca patologia została przywleczona do nas. Nie liczy się styl, talent, osobowość. Liczy się przymuszanie pisarza do bycia niewolnikiem wydawcy, realizacji jego głupich zachcianek na książkę, która będzie „że aż". Totalitarna zasada, że książka zależy wyłącznie od tematu, przetrwała i nazizm, i stalinizm. Nie. Książka nie zależy wyłącznie od tematu. Talent i z opisu listka uczyni wybuch. Oczywiście może być i temat, niekiedy musi, ale cóż on znaczy bez formy? Pisarz to forma, styl i kropka. Tak było i tak będzie, chociaż część pisarzy da się zwichnąć w stronę patologii, pokazanej w filmie „Blef".

Czy jest nas tylko dwoje na całą Europę, ja i Günter Grass, wołających: pracodawcą jest pisarz, a nie wydawca?!!! Odwrócenie tej perspektywy likwiduje pisarstwo, ponieważ lekceważy styl, formę na rzecz „takiego tematu, że aż", wymuszonego przez patologicznego wydawcę.

Wołamy.

Chyba jednak tylko we dwoje. Donośność Grassa jest równa mojej: patologii nie przekrzyczymy. Może jednak przekrzyczmy?

Naraj nasz tak wołał. No to jest nas więcej.

Mieliśmy temat, skargę, ale mieliśmy też jej formę, również teatralizującą. Janusz Korbel włożył nawet karmazynowe fiku-miku na głowę, z uszami czy też, mówiąc po naszemu, *czoŭniem*, podczas czytania swej leśnej skargi. Zainscenizował się świetnie na moje tematyczne życzenie. Rzecz jednak w tym, że skarga to nierynkowa rzecz. Patologiczny wydawca, taki jak w filmie „Blef", nie zechce jej.

Chciałam przerwać koszmar przywleczonej patologii. Żeby nie było: *Kaniu, kaniu, kaniu dajcie, a pa kani pachawajcie*… Pragnęłam kani, po której nie zostaniemy pochowani. Pragnęłam stworzyć antyblef do filmu „Blef". Pragnęłam wskazać, że narzucony temat, jeśli tylko uzyska formę, przemówi donośnie, ależ też miałam na uwadze temat lekceważony w czasach, których ideologowie uznają za czasy jednoznacznie rajskie.

Udało się?

Tak.

Malutkie Narejki, przemienione w Naraj, jakże mocno się powiększyły! Nasze głosy rozlały się po Internecie z wielkim echem, które nie milknie.

Złodziej, cwaniak, kreatura, żądna sławy i pieniędzy za wszelką cenę, po trupach, to ma być pisarz, taki jak w filmie „Blef"?!!! Pisarzem jest człowiek, który temu przeczy. W patologii współczesnej, pokazanej przez Hallstroma, znika z kretesem poeta. Poeta to człowiek wolny, wolnomyślicielski, utalentowany, z absolutnym słuchem językowym,

wyprzedzający każdego badacza mechanizmów epoki, idący przed filozofem – tak było, tak być musi. U nas rzadko który wydawca zainteresowany jest publikowaniem poezji. Znamienne. Wśród wydawców pokutuje współczesny przesąd (patologia rodem z Hallstroma): wierszyki to pisać każdy może, lepiej dajcie jakieś opasłe strutu-tutu tematyczne, może być to proza byle jaka, tylko żeby było, „że aż" ze względu na temat, styl uzdatnimy.

Uzdatnią na styl jednakowy. Redaktor zarobić musi. Redaktor może nie dorastać do pięt autorowi, ale utwór przerobi na swoją średniość. Z przerażeniem notuję, że ani jedno zdanie z moich „Szkiców dla zielonego wróbla", gdzie te patologie wałkuję, nie zużyło się, a książkę napisałam kilka lat temu! Sądziłam naiwnie, że moje przerażenie czas zmniejszy, że krętacze i cwaniacy się opamiętają.

W moim Naraju poeci mieli głos, a okazało się, że literacka grupa Kłosy z Gródka tworzy wiersze na poziomie europejskim, ba, nawet światowym! Już przedtem odkryłam Stanisława Dąbrowskiego. Zdumiewa mnie ta postać. Dekarz z zawodu, tworzy perełki poetyckie. Zresztą w prozie


Fot. Jerzy Chmielewski

Janusz Korbel włożył na głowę karmazynowe fiku-miku

jest równie perełkowy. Już tak jest, że utalentowany poeta czy też osoba, rozumiejąca najwybitniejszych poetów, a ta osoba rozumie, tworzy prozę najdoskonalszą: koncentrat. Bez polewania wodą. Stanisław przeczytał wiersz o tym, jak trzeszczy człowiek, pojmany w zestaw nowoczesnej techniki. Fragment:

(...) ściskane w imakach omłotkowane
poprześwietlane
kuliste łby nitów i spawy jak kleje
w odęty konar ze stali
aż wszystko się zleje aż wszystko się scali
pod czujnym okiem laserów (...)

Mamy początek wieku, zanotowany przez poetę z Kłosów, a jakbym znalazła się w klimatach rewolucji 1917 roku! Początek wieku zawsze ściska człowieka nową techniką, a człowiek wije się, niemal bez wyjścia. Wyjście znajdzie albo i nie. Na początku wieku zawsze człowiekowi źle, bo wszystko co nowe dopiero się zaczyna, najczęściej obnażając kły. Niekoniecznie nawet młody człowiek poradzi sobie z wściekłością początku wieku. Każdy taki początek jest wściekły. Towarzyszy temu fascynacja nową techniką, ale i strach, nieobeznanie, obawa, że zostaniemy w tyle. Osoby starsze źle sobie radzą z komputerową techniką początku wieku, choć niekoniecznie. Znam takich starców, co szybko się wyuczyli obsługi komputera i z uciechą hasają po Internecie.

Jakże miękko zabrzmiała warszawska poetycka skarga Małgorzaty Strękowskiej- Zaremby, jednakże ta miękkość jest rzeczą żeńską, wciąż zamkniętą w czterech kątach:

(...) coraz dalej od wyjścia (...)
nie trzeba muru kluczy ni gróźb
wystarczy (codzienność)
parodia przestrzeni
od szklanych kafelków w kuchni
do tych na ścianie łazienki

A w tle powyższych słów skargi donośnie mi wybrzmiewa Rilke, wprost słyszę jego słowa z wiersza „Przemiana", jakże aktualne, jakże mocno błagające o to, aby kontynuowała je kobieta:

A wieść, że jest ktoś patrzący,
poruszała te mniej,
te wątpliwiej dostrzegalne:
poruszała kobiety.

W naszym Naraju kobiety nie były dostrzegalne ani mniej, ani wątpliwiej, ale poza Narajem już nie ma tak dobrze. Mniej i wątpliwiej nadal jesteśmy postrzegane, nawet przez kobiety. Nie mogę się powstrzymać, muszę o tym jedno zdanie rzec: kiedy pisałam utopię o Naraju, to wstępnie rozmawiałam z różnymi tzw. poważnymi wydawcami, i – dziwna sprawa – telefony odbierały kobiety, i tiu-tiu-tiu, trata-ta, traktowały mnie jak natręta, a utopii nie chciały. E, bo nie. Te baby pojęcia bladego nie mają, że istnieje coś takiego, jak autorski indywidualny styl?!!! Wlazłam prosto do patologii z filmu „Blef". Potem utopia została nominowana do Nike. Nie zwichnęła jednak mnie ta nominacja w kierunku paplania pod wydawcę z filmu „Blef", ani nie spęczniałam z dumy.

Naraj żyje już własnym życiem i będzie żył. I to jak! Tych okołoksiążkowych okoliczności baby od tiu-tiu-tiu trata-ta nie przewidziały. A powinny posiadać coś takiego, jak wyobraźnia! Stanowczo za dużo oczekuję od mojej płci, bo stawiam na kobietę z moich wiosek: twardą, myślącą, wolną i trochę dziką, czyli z wielką wyobraźnią. Jak ja dużo chcę. I tak chcieć będę.

W Naraju było przyjemnie wszystkim. Nikt nie czuł się wykluczony.

Rozmowy (kuluarowe) były istotne, a wiem o tym z Internetu. Prowadziłam zajazd, więc rozmów nie słuchałam. Skoro jednak w internetowych komentarzach mowa o „gęstości rozmów", to znaczy, że stanowiły coś bardzo ważnego.


Fot. Jerzy Chmielewski

Anatol Porębski z grupy Kłosy. Polskość i białoruskość

A więc stworzyliśmy podwórko ważnych rozmów. W lesie. W głuszy.

Polskość z białoruskością to stworzyła. No więc można.

Można po ludzku. Mówię tak, bo białoruskość u nas, ale i w Europie, postrzegana jest wyłącznie politycznie. Jakkolwiek nawiązać poza Narajem do sprawy białoruskości, to zawsze będzie ona ustawiona słusznie i słuszniej. A bo Łukaszenka, a bo Rosja, a bo Białorusini to głupi są, bo hodują reżim, a bo strefy wpływów, a bo lepiej zlekceważyć jakąś tam białoruskość. W naszym Naraju 2012 nikogo to nie obchodziło, taka słuszna i słuszniejsza polityczność.

Beata Górka, młoda osoba, żyjąca za granicą, przeczytała fragment książki słynnej białoruskiej pisarki Swiatłany Aleksijewicz pt. „Czarnobylska modlitwa. Kronika przyszłości". Ktoś potem skomentował w Internecie, że w ten sposób wypowiedziała skargę w imieniu całkowicie bezbronnych.

Fakt. Ofiary katastrof nuklearnych są najbardziej bezbronne pośród bezbronnych. Niby objęte są opieką, niby się o nich pamięta, ale w gruncie rzeczy pozostają wykluczone, samotne, z byle jakim życiem. Tak było przecież z ofiarami Hiroszimy i Nagasaki. I tak jest z ofiarami współczesnych katastrof atomowych, już nie z powodu użycia wojennych bomb, ale z powodu nabudowania tych nowszych bomb, wciąż nieobliczalnych, choć korzystnych dla gospodarek, jakimi stają elektrownie atomowe. Atomowa nieobliczalność z Ukrainy z całą mocą uderzyła w Białorusinów – pamiętamy? Na marginesie: Białorusinka Swiatłana Aleksijewicz jest kandydatką do nagrody Nobla. O, jak dobrze, że Beata wprowadziła ją do Naraju! Poruszająca, mocna proza białoruska przywędrowała do nas zza granicy – Beata mieszka w Blairgowrie w Szkocji. Taka daleka uwaga czyni Białorusinów mniej samotnymi.

Po naszym narajskim spotkaniu wiele osób zaczęło gorzko żałować, że nie wzięło udziału. Cóż. Trzeba było. Zapraszałam. Mówiłam, że będzie to kulturowe wydarzenie, gdzie indziej niemożliwe, ponieważ gdzie indziej działają zagłuszacze osobowości. Sztuka przenosi się na wieś – pisałam o tym wielokrotnie. Ucieka z komercyjnych miast. Uciekajmy choć raz w roku do Naraju.

Bo w świecie mamy koniec postmodernizmu, likwidującego w swej agonalnej i patologicznej formie talent, osobowość, geniusz, zrównującego dyskursy. Mowa o tym w ostatnim eseju Sloterdijka „Pogarda mas". O tym pisałam w mojej ostatniej książce, w „Restauracji strasznych potraw", tak u nas zlekceważonej! Miło mi i niemiło, że idę ramię w ramię w moich rozmyślaniach ze Sloterdijkiem. Miło, że jestem zdolna mu dorównać, a niemiło, bo nigdy nie będę prorokiem we własnym kraju. Jeszcze przed Sloterdijkiem mówiłam o tym, o czym on dopiero teraz mówi. Postmodernizm to regres intelektualny. W Polsce przybrał on szczególnie karykaturalną formę – bełkotania o niczym. Zamiast trzeźwego osądu modernizmu, co się w nim nadaje do reanimacji, a co odchodzi na zawsze, nie przyswoiwszy sobie lekcji holokaustu i lekcji feminizmu, mamy samo bełkotanie o niczym, z dopuszczeniem zrzyny ze starych mistrzów i niedopuszczanych do głosu mistrzów nowych. Tych ostatnich duszą nam zrzynacze w zarodku. Światowa lekcja postmodernizmu nie została u nas zrozumiana ani nawet w jednym procencie! Jak można zrównać dyskurs choćby mój z dyskursem damskiego boksera? Nasz Naraj nie bełkotał nawet w kuluarach, a zatem wpisaliśmy się w esej Sloterdijka dosłownie żywcem. Kilka narajskich rozmów odbyło się z moim udziałem i wiem, że biegliśmy tym samym tropem co Sloiterdijk, a więc V Zajazdem do Naraju stworzyliśmy również coś nowego w agonalnej fazie postmodernizmu: świadomość tej agonii i nasz silny opór intelektualny, nasze pragnienie rozmowy istotnej, a to wszystko jako punkt rozwojowy, jako początek. Mieliśmy na to zgodę ludzi w każdym wieku, i to też jest bardzo ważne. I młodzi, i dojrzali, i starzy stworzyliśmy sobą drugiego Sloterdijka na V Zajeździe do Naraju!


Fot. Jerzy Chmielewski

Mira Łuksza. *I vierniemsia siudy...*

Mira Łuksza w swojej skardze-wierszu wypowiedziała następujące słowa o naszym białoruskim człowieku: *i vierniecca siudy (...) i pašukaje zrokam takich samych*. Słowa te bardzo pasują do nas, ludzi narajskich. *I vierniamsa siudy, i pašukajem zrokam takich samych*? Na pewno.

Polsce zdarzył się nasz Naraj.

Vierniamsa da naszaho Naraju za rok.

Tamara Bołdak-Janowska

Stand By
За Беларусь

fot. Sputnik Photos

Адначасова пушча апустошваецца. Паміраюць жыхары вёсак у пушчы, маладыя мігруюць у гарады. Лес напірае на агароджы, уваходзіць у агароды, заглядае ў вокны хат. Лес таксама ўнутры хат - людзі, якія яшчэ тут жывуць, заўсёды захоплівалі пушчу. Нібы хацелі яе асвоіць, бо хаця такая блізкая, усё ж такі яна застаецца далёкай і чужой.



Ян Брыкчыньскі
ПЯРВОТНЫ ЛЕС




Мы падарожнічаем праз хаты і ўстановы як праз галерэі, поўныя нечаканых кампазіцый. Гэта нечаканасць - смутная. Як краявід пасля бітвы, якая не адбылася. Як погляд у мінулае, калі на памяць ад нашага суіснавання з лесам застануцца напханыя звяры, старыя сцёртыя скуры і пажоўклыя косці ў пустых дамах і офісах.

Беларусь - гэта мая другая айчына, нарадзілася я на Урале, а ў Шчучыне жыву з 1954 года. Мне нічога не шкада. Сын у мяне добры. Жыццё ў мяне было цікавае, ездзіла ў Маскву ў санаторый.



Агнешка Райс
УЗГАДВАЮ ЖЫЦЦЁ І ПЛАЧУ

Калі пачалася вайна, мне было 16 гадоў. Мае браты былі ў партызанскім руху, а я ім дапамагала. Майго брата Аляксандра застралілі немцы ў вёсцы недалёка ад Заскавічаў, а яго цела прывезлі на наступны дзень у камендатуру. Яго паказалі мне і маёй сястры, але мы не сказалі, хто гэта быў. Немцы доўга нас каталі, білі і аблівалі вадой. Мая сястра была вельмі прыгожая, з доўгімі косамі, але гэта ёй не дапамагло. Адбілі нас партызаны. У лесе доўга мяне лячылі, а ачулася, засталася ў атрадзе і стала медсястрой.





Адам Паньчук
I_AM_IN_VOGUE@BELARUS.BY



Мы сядзелі з Сашам каля кафлянай печы, было вельмі цёмна. Саша распавядаў пра беларускую душу, што карані яе ў Савецкім Саюзе, што цяжка знайсці людзей, свядомых сваіх каранёў.





Яны - найлепшыя
з найлепшых.
Яны - пераможцы
нацыянальных
і мясцовых
спаборніцтваў.
Яны - доказ таго,
што ўсё добра.
Яны - гонар нацыі.
Яны ствараюць
вобраз, які ўлады
прадстаўляюць
грамадству.

Рафал Мілах
ПЕРАМОЖЦЫ

Artyści:

Jan Brykczyński
Andrei Liankevich
Manca Juvan
Rafał Milach
Justyna Mielnikiewicz
Adam Pańczuk
Agnieszka Rayss
Victor Martinovich





Календарыюм

Кастрычнік – гадоў таму

750 – У канцы 1262 г. быў заключаны дагавор між князем Міндоўгам і князем уладзімірскім Аляксандрам Неўскім аб сумеснай барацьбе супраць інфлянцкіх крыжакаў.
580 – 15.10.1432 г. князь Вялікага Княства Літоўскага Жыгімонт (малодшы брат Вітаўта) аднавіў унію з Польшчай, але пасьля перамогі над Сьвідрыгайлам ізноў вырашыў вызваліцца ад саюза з Польшчай.
425 – атрыманьне ў 1587 г. горадам Лідай самакіраваньня паводле магдэбургскага права.
345 – адкрыцьцё ў 1667 г. першага на беларускіх землях міждзяржаўнага паштовага маршруту Вільня-Менск-Магілёў-Смаленск-Масква.
330 – 6.10.1677 г. памёр Вайцех Каяловіч (нар. у 1606 у Коўне, гісторык і генеолаг, член ордэна езуітаў, у 1653-1656 гг. – рэктар Віленскай акадэміі, аўтар гісторыі Літвы.
300 – У 1712 г. нар. Сьцяпан Аскерка (год сьмерці невядомы, паходзіў зь сям'і заможнага шляхціца з Навааградчыны), дарадчык прускага караля Фрыдрыха ІІ. Напісаў і прадставіў яму выдатнае наватар-

---

Kaliś śpiawali

Jawor nad wadoju

Mielaszki
W. Doroszkiewicz
N. Łowicka

Śpiewnie /34"/

1.Ja - wor nad wa-do-ju niz - ko pa-
chi-liŭ-sia. Z.U-kra - ji-ny da dziaŭ - czy-ny ka-
zak pry - chi-liŭ-sia. chi-liŭ-sia.

1. Jawor nad wadoju
   Tak nizko schiliŭsia.
   – Z Ukrajiny da dziaŭczyny
   Kazak prychiliŭsia.

2.Kazak prychiliŭsia –
   Na kania siadaje,
   A dziaŭczyna czornabrywa
   Slozy praliwaje.

3. Slozy praliwaje –
   Tak żałasno płacze.
   – Woźmi minie iz saboju,
   Małody kazacze.

4. – Dziaŭczynańka miła,
   Szto budziesz rabiła?
   – Nad rakoju szyrakoju
   Kalinu sadziła.

5.Ptuszki pryletali
   Cwiet kaliny jeści,
   A dla minie, maładoji,
   Prynosili zwieści.

6. Ptuszki pryletali –
   Kalinu dzioŭbali,
   A dla minie, maładoji,
   Praŭdy ni skazali.

*Kożny 3-ci i 4-ty radok paŭtarać.

Ad Walanciny Daraszkiewicz, nar. u 1937 h., i Niny Ławickaj, nar. u 1935 h., u Mielaszkach, hm. Haradok, zapisaŭ 28.IV.1995 h. i aprac. **Sciapan Кора**

*Яшчэ раз зьмяшчаем гэтую песню, бо ў папярэднім нумары памылкова былі надрукаваныя словы іншай песні. Ласкава просім прабачэння. (**рэд.**)*

ское эканамічнае дасьледаваньне „Плян, які не зьяўляецца нормай”.
295 – У 1717 г. нар. Кароль Вырвіч (пам. у 1793 г.), пэдагог, філёзаф. Паходзіў зь сям’і незаможнага беларускага шляхціца з Браслаўшчыны. Выкладчык Collegium Nobilium. Аўтар падручнікаў „Паходжаньне сучасных дзяржаў і народаў”, „Кароткае сыстэматычнае выкладаньне ўсеагульнай гісторыі”, „Сучасная геаграфія”, „Усеагульная геаграфія”.
195 – 15.10.1817 г. пам. Андрэй Тадэвуш Банавэнтура Касьцюшка (нар. 30.11.1745 г. у фальварку Сяхновічы на Берасьцейшчыне ў сям’і беларускага шляхціца) – вядомы палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай.
140 – 17.10.1872 г. памёр Іосіф Гашкевіч (нар. у 1814 г. у Мінскім пав.), вучоны мовазнавец, дасьледчык Японіі і Карэі, расейскі консул у Японіі, з 1867 г. жыў у Малях каля Астраўца.



Курапаты – дарога сьмерці. У гэтым лясным масіве непадалёк ад Менску ў 1937-1941 г.г. бальшавікі расстралялі ад 30 000 да 100 000 (па ацэнках некаторых дасьледчыкаў, да 250 000 або й значна больш беларусаў і палякаў)

120 – 30.10.1892 г. у Клешняках нар. кс. Ян Тарасевіч, беларускі рэлігійны і грамадзкі дзеяч, у 1911 г. выехаў у ЗША. Адзін з пачынальнікаў беларускага руху ў Амэрыцы. Пам. 11.06.1973 г. у абацтве сьв. Пракопа ў гор. Лайл каля Чыкага.
95 – 7-10.10.1917 г. у Маскве адбыўся Першы Усерасійскі Зьезд бежанцаў-беларусаў, скліканы па ініцыятыве Беларускай Народнай Грамады.
85 – 1.10.1927 г. у Вільні выйшаў з друку першы нумар царкоўна-грамадзкага двухтыднёвіка „Праваслаўная Беларусь”. Рэдактарам быў протаіерэй Лука Голад. Часопіс зьяўляўся прэсавым органам Праваслаўнага Беларускага Дэмакратычнага Аб’яднаньня.
85 – 1.10.1927 г. у Вільні пад рэдакцыяй Т. Ліхача выйшаў з друку першы нумар грамадзка-палітычнай газэты „Наша Праца”.
80 – 7.10.1932 г. нар. у Задроздзі на Лагойшчыне нар. Іван Пташнікаў, пісьменьнік.
75 – 22.10.1937 г. расстраляны Лукаш Калюга (Канстанцін Вашына) нар. 27.09.1909 г. у Скварцах каля Койданава, пісьменьнік.
75 – 22.10.1937 г. расстраляны Флярыян Ждановіч, беларускі акцёр і рэжысёр (нар. 28.10.1884 г. у Менску). Закончыў драматычную школу ў Варшаве (1902), арганізаваў беларускія спектаклі і Першае беларускае таварыства драмы і камедыі ў 1917 г. У 20-ыя гг. быў першым мастацкім кіраўніком і акцёрам Беларускага Дзяржаўнага Тэатру (БДТ-1) у Менску. У 1930 г. арыштаваны і сасланы на прымусовую працу на Беламорканал.
75 – 23.10.1937 г. расстраляны Уладзімір Крыловіч (нар. 1.11.1895 г. у Крыловічах каля Койданава), акцёр.
75 – 29.10.1937 г. расстраляны Якаў Бранштэйн (нар. 10.11.1897 г. у Бельску на Падляшшы), пісьменьнік і літаратурны крытык.
75 – 29.10.1937 г. расстраляны Анатоль Вольны (Ажгірэй), нар. 2.12.1902 г. на станцыі Пухавічы на Меншчыне, пісьменьнік, аўтар аповесьці „Два” (1925), „Антон Савіцкі” (1927), зборнікаў вершаў „Чарнакудрая радасьць” (1926), „Табе” (1927), песьняў і сцэнарыяў для кіно.
75 – 29.10.1937 г. расстраляны Міхась Зарэцкі (Касянкоў), нар. 20.11.1901 г. у Высокім Гарадцы Талачынскага р-на, пісьменьнік, аўтар раманаў „Сьцежкі-дарожкі” (1927), „Вязьмо” (1932).
75 – 29.10.1937 г. расстраляны ў Менску Алесь Дудар (Аляксандр Дайлідовіч) нар. 24.12.1904 у Навасёлках Пертыкаўскага р-на, паэт і тэатральны крытык (Тодар Глыбоцкі).
75 – 29.10.1937 г. расстраляны ў Курапатах Платон Галавач, нар. 18.04.1903 г. у Пабокавічах каля Бабруйска, пісьменьнік, аўтар аповесьцяў „Вінаваты” (1929), „Спалох на загонах” (1930), „Праз гады” (1934).
75 – 30.10.1937 г. расстраляны Янка Нёмаскі (Пятровіч), нар. 12.04.1890 г. у Шчорсах, пісьменьнік і грамадзкі дзеяч, працаваў у планава-эканамічных органах БССР, вучоны сакратар Інстытута Эканомікі АН БССР, намесьнік старшыні Дзяржплана БССР.
75 – 31.10.1937 г. расстраляны Антон Баліцкі, нар. 17.09.1891 г. у Балічах на Гарадзеншчыне, асьветны дзеяч БССР, рэалізатар палітыкі беларусізацыі.
65 – 30.10.1947 г. у Баку нар. Валянцін Елізар’еў, выдатны беларускі балетмайстар.
35 – 24.10.1977 г. памерла Лідзія Ржэцкая, нар.17.04.1899 г. у Менску, актрыса з 1921 г. у Тэатры ім. Я Купалы.
20 – 31.10.1992 г. у Гародні памёр Міхась Ткачоў (нар. 10.03.1942 г. у Мсьціславе), археолаг і гісторык, з 1978 г. працаваў у Гродзенскім унівэрсытэце, з 1989 г. намесьнік БНФ.
15 – 1.10.1997 г. ва ўнівэрсытэце ў Беластоку пачала працаваць Катэдра Беларускай Культуры. Узначаліла яе праф. Альжбета Смулкова.

Апрацавалі **Лена Глагоўская і Вячаслаў Харужы**

Leon Moenke

Stawka o życie

10. Radość z powodu posiadania 1 rubla 37 kopiejek mię rozpierała. Poszedłem pieszo. Ruch mi był po prostu potrzebny, by dać ujście podnieceniu.

Spieszyłem również, by trafić do sklepu przed zamknięciem, wiec prawie biegłem, potrącałem przechodniów na prawo i na lewo bez żadnego pardonu. Ci się tylko oglądali.

Wszedłem do sklepu jak triumfator. Wczorajsza sklepowa powitała mię uśmiechem.

– No, co? Dostaliście?

– Mam.

– Cóż wam pokazać? Buciczki? Sandały?

– I jedno, i drugie.

– O, to bogacz z was dzisiaj – żartowała. – Cieszy mnie to bardzo, gdyż tylko prawie u nas można teraz dostać obuwie dziecinne.

Na ladzie pojawiło się obuwie.

– Radzę wam, towarzyszu, wziąć buciczki i kaloszki. Kaloszki kosztują tyle, co sandały. Buciczki wystarczą mu z pewnością na lato i jesień. Na jesień i niepogodę będzie miał do nich lekkie kaloszki na spacer.

Chętnie na to przystałem. Nie mogliśmy się porozumieć co do numeru obuwia. Wciąż mi się wydawało, że buciczki, proponowane przez sklepową będą za małe. Jeśli się nie mylę, wziąłem nr 2. Wziąłbym nawet trzeci, gdyby nie był o 10 kopiejek droższy. To już przekraczało moje możliwości finansowo-torgsinowskie o 3 kopiejki.

– Szkoda, żeście nie wzięli starych buciczków lub miarki, tobyśmy się przekonali, że mam rację – twierdziła sprzedawczyni.

– Rubel 30 kopiejek do kasy!

* * *

Z triumfem niosłem buciczki do domu. Istotnie było co pokazać. Kosztowały one: dwudniowe wysiłki, zrezygnowanie z biletów do Leningradu, narażanie się na 3-letnie więzienie, szarotkę, 46 rubli sowieckich i medal srebrny, który otrzymał gorodowoj „za usierdie" od Mikołaja II...

Do późna w nocy nie dawała mi zasnąć myśl: „Czy nie zapłacę za nie zniweczeniem ucieczki?".

„Co niesie z sobą dzień jutrzejszy?...".

„Kurier Wileński" nr 27, 28.01.1938 r., s. 5.

Dzień pożegnania

– Ja uciekać z tobą nie będę – oświadczyła mi z rana żona. – Na zesłanie również nie pojadę. Zostanę tu, w Moskwie, z Jureczkiem.

– Co, ponownie się cofasz?! W ostatniej chwili?!

– Tak!

– Co ci jest, kobieto?!

– Nic. To, co słyszysz.

– Ależ zrozum! Ile razy mam ci powtarzać? W Moskwie w żadnym razie nie zostaniesz.

– Dlaczego? Wczoraj mi naczelnik powiedział, bym 12-go przyjechała do obozu do pracy. Otrzymam pokój z werandą.

– Ale 13-go powie ci, byś do wieczora opuściła teren obozu i jechała za mną do Kazachstanu, albo cię aresztują w razie mojej ucieczki. Wsadzą cię do więzienia.

– Nie wsadzą! Za co?

– Za to, żeś nie doniosła! Jeśli zaś nie ucieknę, a pojadę na zesłanie, to i w tym wypadku w Akademii nie zostaniesz! Czy nie dość ci tego, co powiedział już prorektor Uniwersytetu Zachodu, gdy oświadczyłaś mu, iż ze mną się rozchodzisz, czy już się nawet rozeszłaś, i pozostajesz nadal w Moskwie?!

Milczenie.

– Powiedział ci przecież: „Jako lektorka języka polskiego towarzyszka pozostać u nas nie może, gdyż na męża towarzyszki padł cień". A gdy mu powiedziałaś: „Więc nie mogę pozostać na posadzie, bo na mnie pada cień cienia?", to ci odpowiedział przecie krótkim: „Tak". Czy nie „radził" ci jechać ze mną na zesłanie? Może jeszcze, jak on to lubi, prawił ci morały, bo jego żona pojechała za nim na katorgę carską i dożywotnie zesłanie, chociaż zabił z pobudek politycznych jej ojca?

Znowu zawzięte milczenie. Nie traciłem jednak cierpliwości.

– Zrozum wreszcie, iż w Akademii Wojskowej postąpią z tobą nie inaczej jak w Uniwersytecie, gdy się dowiedzą o mnie. Dostałaś się tam przecież również jako moja żona, żona partyjniaka bez skazy i plamki, dobrze widzianego przez potentatów. Teraz zaś już nie jestem tym, kim byłem. I tam ci powiedzą: „Na męża towarzyszki padł cień...".

– Radziłam ci przecie zerwać znajomości z... Ale ty nigdy nie słuchasz tego, co się tobie mówi, a zawsze robisz po swojemu – zaczęła robić mi wyrzuty, z wyraźnym zamiarem skierowania tej rozmowy, jak zwykle, na ślepe tory. To już wzburzyło mnie.

– Nie mamy czasu na jałowe dyskusje. Musimy się wreszcie decydować. Sam uciekać nie mogę, bo cię aresztują i, pomimo ciąży, będą badać wszelkimi sposobami. Pojadę wobec tego jutro na zesłanie. Ale po mym wyjeździe na zesłanie wszyscy pozrywają znajomości z tobą. Pracy w Moskwie mieć nie będziesz. Zabiorą ci kartki żywnościowe. Jureczka zaś wyrzucą z Kombinatu. Wbrew twojej woli zmuszą cię jechać z nim do Kazachstanu za mną. Rektor uniwersytetu dał przecież to wyraźnie do zrozumienia, gdy powiedział: „Towarzyszu! Przekonajcie waszą żonę, by nie

robiła nam przykrości, a jechała z wami”. Chcesz zrobić tę „przykrość”?! Zrozum, że z twojej przyczyny wszyscy będziemy gryźć ziemię w Kazachstanie. Z partii wyleje mnie towarzysz Szarangowicz nazajutrz po przyjeździe. Będę wówczas „socjalnie obcym i klasowo wrogim elementem” i pracy nigdzie nie dostanę. Inżynierem nie jestem. Ty zaś chyba wróbli będziesz uczyła polskiego języka, jeżeli tam są. Zdechniemy z głodu tam wszyscy, razem z Jureczkiem i tym dzieckiem, które ma przyjść na świat. Więc jadę jutro sam do Kazachstanu, lecz nie dłużej jak za 10 dni spotkamy się tam wszyscy. Przykuci jesteśmy jeden do drugiego. Rozumiesz?!

Milczenie. Słowa me trafiały jak w mur.

– Więc mówże wreszcie! – wybuchnąłem po chwili. Jedziesz dziś do Leningradu, czy nie?

– Pojadę – odpowiedziała po pewnym namyśle z opanowaniem. – Jadę ciebie doprowadzić. Uciekać będziesz sam. Zobaczę przy tej okazji Leningrad i wracam do Moskwy. Nic mi się nie stanie. 12-go staję do pracy w obozie. Zostanę w Moskwie z Jureczkiem.

– Więc jedziesz ze mną do Leningradu?!

– Tak. Powiedziałam ci już.

– Więc chodź do uniwersytetu likwidować sprawy i zabrać wszystkie należne nam pieniądze. Bierz kartki żywnościowe. Trzeba je oddać.

„Kurier Wileński” 28, 29.01.1938 r., s. 5.

Cdn

З эпісталярнай спадчыны

Пісьмы Міколы Канаша – вязьня сталінскіх лагероў

У 1993 годзе я вырашыў сабраць вершы беларускіх паэтаў, прысвечаныя нашай паэтцы і змагарцы Ларысе Геніюш (1910-1983). Напісаў пра гэта невялікую нататку „У вянок Ларысе Геніюш” у тыднёвік „Літаратура і мастацтва”, дзе яе і надрукавалі. А з калектывам Зэльвенскай раённай газеты дамовіўся, што ўсе вершы будуць дасылаць у рэдакцыю, а я іх потым забяру. Завёў спецыяльную папку, падпісаў яе, паклаў рэдактару Ірыне Васілеўка на стол, і чакаў паэтычныя радкі ад беларускіх творцаў. Праз пэўны час завітаў у Зэльву, зайшоў у рэдакцыю, дзе ў папцы ўжо чакалі мяне пісьмы і вершы, прысвечаныя Ларысе Геніюш. Сярод пісем быў ліст і з горада Жлобіна Гомельскай вобласці ад Міколы Канаша. Пісьмо гэта сёння публікуецца. Я хуценька адказаў спадару Канашу і шчыра падзякаваў за вершы ў вянок Ларысе Геніюш яму, які шмат гадоў з ёю сябраваў, даслаў таксама яму свой першы паэтычны зборнічак „Шчырая Шчара” з вершам „У хаце Ларысы Геніюш у Зэльве”. Так мы сталі перапісвацца.

Пазнаёміліся Мікола Канаш і Ларыса Геніюш у Інце ў 1949 годзе. Жаночы чацвёрты ОЛП (особые лагера политических) у якім знаходзілася Ларыса Геніюш, быў недалёка ад мужчынскага лагера – кіламетраў чатыры. Там адбываў тэрмін за прыналежнасць да СБМ (Саюз беларускай моладзі) і Мікола Канаш. Паміж лагерамі працавала пошта, хоць нярэдка здараліся і правалы. Паэтка вяла вялікую перапіску і кожнаму адрасату давала псеўданім. Міколу часцей за ўсё называла сынам ці братам. Ён працаваў у шахце, на адбойным малатку, штодня выбіваючыся з сіл. Праца гэтая лічылася найцяжэйшай. Выкарыстоўвалі на ёй пераважна маладых і хто меў тэрмін зняволення ў 25 гадоў. Але час для перапіскі Мікола Канаш знаходзіў. Лісты ад яе хаваў у самой шахце, а некаторыя проста нішчыў. Праўда, сустрэцца ў ссылцы ніяк ім не атрымлівалася.

Пасля смерці Сталіна, у 1954 годзе, калі дыхаць стала вальней, яму ўсё ж удалося першы раз спаткацца з беларускай паэткай. Аднойчы, калі Ларыса працавала на таварнай базе – адкідвала снег ад дзвярэй, прабівала пад’езды, яны сустрэліся. Але ў хуткім часе Міколу Канаша пагналі па этапах, і сувязь паміж імі перарвалася. Але аднаго дня ў рукі яму трапіла газета „Уголь стране”, што выдавалася ў Інце спецыяльна для зняволеных. На адной са старонак ён убачыў верш на рускай мове „Уголь”. Пад ім стаяў подпіс – Лариса Гениуш. Яны зноў наладзілі, на гэты раз ужо афіцыйную перапіску.

У 1955 годзе паэтку ўзялі на этап з лагера пасёлка Абэз і павезлі ў Казахстан. З таго часу іх сувязі зноў перарваліся. І толькі ў 1970 годзе, тады Мікола Канаш яшчэ жыў у Комі АССР, пошта прынесла яму ліст з роднай Беларусі. Ларыса Антонаўна пісала: „Столькі часу мінула… Я цябе шукала і думала па-рознаму… Чакаю ў госці…”.

Спадар Канаш сядае на самалёт і ляціць на Беларусь аж у Гродна. Адтуль аўтобусам у Зэльву. Пастукаў у дзверы. Адчыніла незнаёмая яму жанчына.

– Вам каго? – спытала яна.

– Мне Ларысу Антонаўну.

– Я і ёсць. А хто будзеце вы?

– Я – Мікола Канаш.

– А чым вы гэта дакажаце?..

– Пастараюся даказаць…

– То заходзьце ў хату, – запрасіла спадарыня Геніюш…

Так яны спаткаліся. А потым, калі Мікола Канаш у 1973 годзе назаўсёды пераехаў з Комі на Беларусь, сустракаліся часцей. У інтэрв'ю Алесю Карлюкевічу (ЛіМ, 10 снежня 1993 года) Мікола Канаш прыгадваў: „Я тады быў яшчэ малады, і па спартыўнай выпраўцы і вопратцы многія мяне лічылі супрацоўнікам органаў дзяржбяспекі. Наведваўся, а праз дзень ці два знікаў у невядомым напрамку. Літаральна праз некалькі гадзін мог аказацца ў Вільні ці ў Мінску, альбо ў Латвіі ці ў Паставах. А з сабою вёз новыя вершы, сфатаграфаваныя на пазітыўную плёнку, праяўленую там жа, у Ларысы Антонаўны. Плёнка займала вельмі мала месца і пры зразумелых абставінах магла быць знішчана ці выкінута ў дарозе. Прыязджаў у Зэльву без шапкі і акуляраў, а недзе ў Баранавічах надзяваў і тое, і другое. Магчыма, усё гэта было і залішне, але, прайшоўшы праз многія выпрабаванні, сутыкнуўшыся з мноствам прадажных стукачоў, вымушаны мы былі так рабіць. Ларыса Геніюш у гэтых адносінах была вельмі прадбачлівая. І многіх наведвальнікаў проста з парога выпраўляла з ветрам…”.

Мікола Канаш адбыўшы сталінскія лагеры, а потым адпрацаваўшы шмат гадоў шахцёрам, меў добры заробак і пенсію. Таму ён часта высылаў Геніюшам пасылкі, асабліва, калі адпачываў на Поўдні, то адтуль слаў апельсіны, лімоны, іншую на той час экзатычную садавіну ў Зэльву. Гэта дзякуючы Міколу, мы маем сёння дзесяткі, а то і сотні фотаздымкаў з выявамі Геніюшаў, іх сваякоў і сяброў, фотаздымкі хаты, пакояў, дзе жыла вялікая паэтка. Бо ў хаце Ларысы Антонаўны і Івана Пятровіча ён заўсёды быў самы дарагім госцем.

Чытачам „Czasopisa” прапаную некаторыя лісты Міколы Канаша, якія захоўваюцца ў маім хатнім архіве, а таксама ягоны фотаздымак, зроблены ў Зэльве. Гэтыя лісты ён пісаў да мяне, адказваў на мае пытанні, рабіў каментар, разважаў, прыгадваў сваіх сяброў.

Сяргей Чыгрын

Шаноўныя супрацоўнікі газеты „Праца”!

У „ЛіМе” ад 29 кастрычніка 1993 года я прачытаў невялікую нататку пад загалоўкам „У вянок Ларысе Геніюш”. І вырашыў Вам даслаць два вершы аўтараў, якія прысвечаліся менавіта ёй былымі вязнямі ГУЛАГу, у якіх будзе ўсё зразумела без каментарыяў.

Першы верш Васіля Супруна са Слоніма, верш, які быў напісаны ў 1954 годзе ў г. Інта, тады ён горадам яшчэ не называўся, а проста пасёлкам Інта. Рукапіс верша дасланы мне ў тым жа 1954 годзе самой Ларысай Геніюш у лагер, каб я захаваў яго да лепшых часоў (гэта невялікая шпаргалка, напісаная макавымі літарамі самім аўтарам Васілём Супруном). Перахоўваў я яе ў каўняры лагернага бушлата, які захоўваецца ў мяне да сёння. Вось гэты верш без ніякіх паправак.

Мо' адчай гэтых слоў пачуццём калыханых,
Не кране твайго сэрца, грудзей не кране.
– То аддай іх сама для другіх закаханых
І ў адказ напішы мне адзінае „не”.
–Я не ўмею кахаць далікатна схіліўшы
Потны лоб на калені марожаных мар,
І латаны бушлат на хаду расшпіліўшы
Не вучыўся лятаць ад бяздоння да хмар.
Мо' каханне маё, як гнілое павідла,
Ці як нумар прышыты на спіны сяброў.
Для цябе, для вачэй тваіх мілых абрыдла
І сівым павуком п'е гарачую кроў?
– Ты скажы ж мне, скажы, з нецярпеннем адказу
Буду ноччу і днём адзінока чакаць.
Толькі весткі свае не пішы па заказу,
Не вучы мяне ў пошуках шчасця блукаць.
Не пытай. Не скажу. Дагадайся сама,
Чаму вусны ўсмешкі не знаюць.
Чаму вочы, як ноч, ці як тая турма,
Без жыцця ў цішыні дагараюць.
Не скажу, не скажу табе болю свайго
І душы не адкрыю ў няволі.
Хай глыбокія стогны, што мруць пад табой,
Тваіх дзён не кранаюць ніколі.
Мне не цяжка. О, не падумай хаця,
Што бяссільна схіліўся на нары.
І ў хвіліны тугі праклінаю жыцця
Злыя буры, шляхі і пажары.
Не, не кляў, не кляну із разбітых грудзей,
Не пачуеш ты просьбы нікчэмнай!
Хоць пакуль што жыву толькі ранкам надзей,
Але прошукі злыдняў дарэмны.

І другі верш, прысвечаны Ларысе Геніюш аўтарам Віталем Губарэвічам у той жа Інце ў 1955 годзе. Віталь Губарэвіч 1926 года нараджэння быў родам з Гродзеншчыны, Дзятлаўскага раёна. Вершы свае пачаў пісаць у ГУЛАГу на рускай і беларускай мовах, мой добры сябра па лагеру. Ларысе Геніюш час ад часу траплялася чытаць вершы В.Губарэвіча, яна натхняла яго добрым словам і верай у свае сілы.

Да Ларысы Геніюш
Зраднiла мяне муза не ў хаце –
Прыйшла за краты да мяне яна.
І першы гук мой аб нявольным браце
Паляцеў у свет, з турэмнага вакна.



былыя лагернікі – Ларыса і Іван Геніюшы, Мікола Канаш

Я ліру змайстраваў сваёй рукою,
І струны крыху тоўстыя на ёй,
І не прыемна чуць яе парою,
Бо вуха рэжа вострый голас мой.
Ды што рабіць і я спяваў калісьці
Лірычну песню, але гэты спеў
Гучаў у сёлах родных без карысці,
І не будзіў майго народа гнеў.
Прабач мне самазваннаму паэту,
У няроўнай вырасшаму барацьбе,
Што пасвячаю табе песню гэту
І што сястрою называю ў ёй цябе.
Ты гаммаю акордаў мілагучных
Напоўніла мне сэрца да краёў,
І вобразаў так родных, не адлучных
Чарга перад вачыма ўстала зноў.
І я за ліру узяўся міма волі,
І грозна песня загула мая.
Яна пяе братам маім аб волі,
Аб родных, дарагіх краях.
Але не плач у песні гэтай льецца,
Яна гучыць, як атамана кліч.
Праклящцем грозным з сэрца майго рвецца,
Ўздымая помсты ўсенароды біч.
І пакуль у маім краі бяздольным
Шчэ не змоўк гук роднае мовы,
Буду несці я брацццям нявольным
Кастуся Каліноўскага словы.
Каб народ мой крывіцкі, слаўны,
Разбудзілі слоў маіх стрэлы.
Каб у неба сцяг дзяржаўны
Узвіўся б бел-чырвона-белы.
Ціснуць сэрца тугою жалезнай
Драцяныя калючыя лапы,
Бо з радзімы па тундры бязмежнай
Усё ідуць і ідуць этапы.
І хоць у сэрцы маім гнаіцца
Несцярпіма балючая рана,
Аднак плакаць не трэба вучыцца…
Не, хаўтуры спраўляць яшчэ рана.

Віталь вершы пісаў экспромтам, так, як і Ларыса, не шліфаваў іх, таму прабачце за дапушчаныя памылкі. Дасылаю вам яшчэ фота, зробленае мною ў хаце Ларысы ў Зэльве, незадоўга да яе смерці. На фота: Зося Каліноўская – яе блізкая суседка, якая увесь час дапамагала Ларысе па гаспадарцы і заслугоўвае ўвагі.

Мікола Канаш, 5.11.1993 г.

Шаноўны Сяргей Мікалаевіч, добрага дня Вам!

Па-першае, вялікі і шчыры Вам дзякуй за зборнічак вершаў „Шчырая Шчара" з аўтографам. Ён зойме на паліцы ў мяне ганаровае месца сярод іншых выданняў пісьменнікаў з аўтографамі, і ў першую чаргу Ларысы Геніюш, Дануты Бічэль-Загнетавай, Уладзіміра Арлова, Ніла Гілевіча і іншых вядомых пісьменнікаў з пажаданнямі сціплых і родных слоў сардэчнасці. Спадзяюся, што ён будзе не апошнім тваім выданнем…

Прачытаў яго за адзін прысед, нібы праглынуў глыток гаючай вады святой Жыровіцкай крынічкі.

Дасылаю Вам сем здымкаў. На мой погляд, яны яшчэ нідзе не друкаваліся, хаця маю значна больш, але іх трэба яшчэ рабіць, негатывы захоўваюцца, а многія раздаў. Відаць, адзін з іх Вам ужо вядомы тым, што Вы успамінаеце ў сваім вершы: „Хвартух адзеўшы свой квяцісты, гасцей любіла сустракаць…". Так, сапраўды, і было. Дык вось на гэтым фота каля ўваходу на ганак відаць стаіць бетонная ваза, у якой заўсёды раслі кветкі. І калі Ларыса засталася адна без мужа – нехта-злачынца паваліў яе ўздоўж ступеняк і ваза старой перашкаджала праходзіць, а сілы адкаціць не было. І так доўгі час праз яе Ларысе прыходзілася перапаўзаць. Я збіраўся прыехаць і адцягнуць яе, але атрымаў ліст ад Ларысы, дзе яна пісала, што наведаўшы яе адзін з мастакоў адкаціў вазу далёка да плоту.

Вы пытаецеся пра Зосю Каліноўскую, то яна жыве ў Зэльве на Савецкай вуліцы № 5, кв.4, што побач з Ларысіным. Па мужу яна Марцінчык.

Ад В.Супруна я меў адзін толькі ліст, але гэта было дзесьці больш года таму. Неяк з ім наша сувязь не атрымалася. Я ж ніякі ні літаратар, і пішу з памылкамі і не цікава. Відаць, гэта і з'явілася спыненнем нашых суадносін. Але мне ягоныя вершы падабаюцца, якія я сустракаў у друку, даволі крылатыя, смелыя. Там, у зняволенні, мы не сустракаліся. Ён, відаць, быў на другім ОЛПе. Віталя Губарэвіча я сустракаў толькі ў зняволенні, захаваў каля двух дзесяткаў ягоных вершаў з тых часоў. Яго ўжо няма ў жывых, ён памёр, дзесьці ў сябе на радзіме ў сярэдзіне ці пачатку 1970-х гадоў. Ведаю, што ў яго жывая яшчэ маці. А больш падрабязна пра В.Губарэвіча можа Вам раказаць яго блізкі зямляк Іван Мароз, які таксама быў у зняволенні ў тыя страшныя часы і сустракаўся з яго маці. Ён быў маім сябрам па лагеру. Даю Вам ягоны адрас, ён жыве

ў Мінску. Іван Мікалаевіч Мароз – даволі адукаваны чалавек, пасля вызвалення закончыў Мінскі палітэхнічны інстытут. Жыве па адрасе: 220092 г. Мінск, вул. Берута, 4, корп.4, кв.26.

Добра сябраваў з Ларысай Антонаўнай у лагеры (таксама мой сябра), ведаю, што аднойчы ў Зэльву ён прыязджаў, пра гэта мне пісала Ларыса і Прыстаўка Вячаслаў. Ён жыве ў Віцебскай вобласці ў Шаркаўшчыне, вул. Даватара, 10. Між іншым, Ларыса ў сваёй „Споведзі" успамінае і яго двума словамі. З ім я пасля вызвалення ніколі не сустракаўся. Неяк напісаў ліст яму, але адказу не атрымаў. І яшчэ адзін адрас: 225320 г. Баранавічы, вул. Камуністычная, 10, кв.65. Рашэтнік Пётра А. Ён таксама ў зняволенні добра ведаў Ларысу Геніюш. З ім я некалькі разоў ездзіў да Ларысы Антонаўны ў Зэльву. У зняволенні з Пётрам за сустрэчу з Ларысай нам дваім далі па 15 сутак „Буру". Пра гэта некалі пісала газета „Рэанімова", якая выдавалася неафіцыйна ў Гродне.

І апошняе. Маё інтэрв'ю журналісту А. Карлюкевічу таксама друкавалася не толькі ў „ЛіМе", але і ў нашай раёнцы „Новы дзень". Але ў абоіх выпадках дапушчана была памылка ў вершы „Краіна родная, не плач слязьмі крывавымі". У чацвёртым радку слова „далёй волю", трэба чытаць: „далёкай волю, пад новы ўраджай".

Усе гэтыя вершы ёсць у інтэрв'ю, калі Вас цікавіць, цалкам магу даслаць. Яны даволі цікавыя, але ў „ЛіМе" іх не надрукавалі, а, значыць, так зрабілі і ў перадруку.

З павагай да Вас –

Мікола Канаш, 21.03.1994 г.

Добрага дня Вам, Сяргей Мікалаевіч!

Атрымаў другі ліст, дзякую за шчырасць. Усе Вашы пытанні не з лёгкіх. Адносна вершаў Ларысы Геніюш, дык шмат дзе яны друкаваліся, а адсачыць усе, жывучы ў жлобінскай рускамоўнай глыбінцы, не так проста, дзе беларускасцю не пахне ў кніжных лаўках. Хаця прыкладна ведаю ўсё ж, што ёсць такія, але для іх не наступіў яшчэ спрыяльны час, каб друкаваць. Адносна здымкаў – іх шмат, хопіць на цэлы альбом, але справа не ў грошах, а ў паперы і хімікатах, каб здымкі зрабіць. А іх у нашых крамах няма. Дый веснавы час пачаўся, глеба кліча да працы, хаця і сілай ужо не пахвалішся, бо гады бяруць сваё. Дасылаю Вам яшчэ фота. На адным з іх – Ларыса Геніюш у накінутай вялікай хустцы ў кветкі. Ведаю, што такую падараваў ёй Максім Танк, але дакладна сёння не магу сказаць, што менавіта гэта тая самая хустка і ёсць. Каб упэўніцца, прыйдзецца Вам удакладніць у Зосі Каліноўскай ці, магчыма, у Дануты Бічэль-Загнетавай. На пахаванні Ларысы мімалётна ставілася гэта пытанне, каму хустка дастанецца ў спадчыну. Вядома, лепш было б, каб трапіла яна ў музей. Другі здымак зроблены ў гародчыку на лавачцы сярод кветак. Як вядома, Ларыса вельмі любіла кветкі, іх старанна даглядала, каб добра раслі. Аднойчы ў канцы траўня ці ў пачатку чэрвеня, калі вучні развітваліся са школай, нехта ноччу залез у гародчык і зрэзаў аж 200 кветак цюльпанаў. Але не хачу грашыць на шкоднікаў, бо большасць з іх адносіліся да Ларысы з вялікай павагай, многіх яна хрысціла, бывала на вяселлях, адпраўляла ў салдаты, хадзіла на нараджэнні і г.д. Ёсць нават у мяне і такія вершы, відаць, яны ў зэльвенцаў захоўваюцца да сяння, захоўваюцца тыя, каму яна прысвячала.

Ларыса Геніюш моцна верыла ў Бога. І калі мы развітваліся, то заўсёды мяне жыгнала і таму мне шанцавала ў дарозе. Апошні раз, калі я развітваўся ў хаце на парозе, выйшаў да веснічак каля варот, хацеў агляну́цца і памахаць яшчэ рукой, бо адчуваў, што яна стаіць яшчэ на ганачку, і, толькі хацеў павярнуць галаву, пачуў, як яна закрычала: „Не адварочвайся. Інакш гэта будзе апошні раз…". Але я левым вокам усё ж паспеў угледзяць Ларысу. Паверыш, і, сапраўды, гэта была наша апошняя сустрэча. Праз некалькі месяцаў яе не стала. Прабач, я адхіліўся ад той думкі, якую пачаў. І вось трэці здымак, рука партакрата, бракуе вядома на ёй зоркі, думаю здагадаліся з якіх меркаванняў. Яшчэ ў 1954 годзе Ларыса пісала:

І ў магіле патраплю я жыць.
Трэба тысячу кобравых жалаў,
Каб біццё майго сэрца спыніць…

У першым лісце даслаў Вам віншавальную картку, арыгінал значна большы і каляровы, яна ёй вельмі ганарылася і стаяла яна на палічцы з кнігамі пад шклом у пакоі, дзе прымала гасцей. Ёсць і ў яе свая гісторыя.

У 1980 годзе, за два месяцы да юбілею, я быў у Зэльве і зрабіў тры варыянты здымкаў, дзе Ларыса Геніюш прадзе за калаўротам. Адзін такі здымак змешчаны быў у „Споведзі" (негатыў захаваўся). У той час сябры прасілі Ларысу, каб болей пісала вершаў. Адказ быў такі: няма ахвоты, зараз займаюся толькі пражай, вядома, і пасылала ім здымкі. І вось тады ў кагосьці з мастакоў нарадзілася такая думка зрабіць віншавальную картку…

А цяпер да Вас пытанне, Сяргей Мікалаевіч. Скуль Вы ведаеце, што Віталь Губарэвіч пісаў добрыя вершы? Я Вам даслаў толькі адзін, прысвечаны Ларысе Геніюш. Але я не сказаў бы, што вершы Губарэвіча вельмі добрыя, пісаў ён іх у лагеры экспромтам, захаваць магчымасці добрай не меў. Ён казаў мне, што ўсуну ў бутэльку і закапаю, магчыма, нехта натрапіць, але шансу на гэта не было ніякага. Таму ўзяў я іх сабе, перачытаў і, лепшыя на мой погляд, вывучыў на памяць, іншыя – прыхаваў у шахце. І толькі пасля выхаду на волю, пачаў прыводзіць да парадку. І, такім чынам, што захаваў, тое маю і сёння. Усе іншыя, відаць, прапалі, як ён пісаў сам. І ўсё ж, вядома, мне хацелася нейкім чынам зрабіць так, каб пачулі іх людзі. Я стараўся падобнае рабіць, але поўнай

галоснасці дасягнуць так і не змог. Па-першае, вершы неабходна яшчэ адшліфаваць і толькі потым пусціць у друк, а гэта не так і проста. Па-другое, ёсць у Губарэвіча вершы і на расейскай мове, значыць, іх трэба перакласці на нашу родную мову. Але я не паэт, таму брацца не за сваё, я не мог. Вось адзін з вершаў дасылаю Вам.

Нет терпенья, струны мои порвались,
Дни ползут караваном тягучим,
Вокруг сердца тернистой змеёй обвились,
В душу впились железом колючим.
Да, я жизнь отдал Вам люди,
Своей кровью хотел искупить ваш грех.
Близок час мой, чахоткою сушит мне груди,
Сердце давит тоска погребальная. Эх!
Не арабский пророк я и не иудей,
Я родился в семье белоруса,
Я хочу умереть, умереть за людей,
Но не смертью святого Иисуса.
И стоять не хочу у стенки камней,
И чекист, чтобы руку вскидывал.
Я хочу умереть, чтобы смерти моей
Мой коварный бы враг позавидовал.
Я хочу умереть в самой гуще врагов,
Допьяна его крови напиться,
И последним рывком, всею силой зубов
В его горло проклятое впиться.
На могиле хочу, чтоб не камень лежал
Над простором полей, гор и рек.
В славных песнях своих, чтоб народ мой сказал,
Как за правду погиб человек.
На могиле хочу, чтобы камень лежал
Целых тысяча лет, не один только век,
А на камне на том, чтоб народ написал
Слова три: «Здесь лежит человек!». Інта, 1955 год.

Мікола Канаш. 11.04.1994 г.

Добры дзень, шаноўны Сяргей!

Дабра і творчых поспехаў жадаю табе ва ўсіх пачынаннях. Вялікі дзякуй, вуснамі Ларысы Геніюш, кажу я вам дваім – табе і Міхасю Скоблу, за факсімільнае выданне кнігі Ларысы Антонаўны „Ад родных ніў", якую вы выдалі ў Слонімскай друкарні. І Міхасю дзякуй асабліва, што даслаў мне – і гэтым самым даставіў мне вялікую ўцеху. Добрую справу вы зрабілі, хлопцы. Зрабілі на карысць нашага грамадства, для сумленных беларусаў адкрылі вочы на рэчаіснасць. Дык няхай вам спорыцца!

А цяпер дасылаю табе, Сяргей, тры фотакарткі. На адной з іх – помнік Івану Пятровічу, дзе ўказаны дата нараджэння па-старому стылю – 1902 г. 21 лютага і дата смерці па-новаму стылю каляндара – 1979 г. 8 лютага. А далей словы Ларысы:

Па сонца асветы ўзлятаў, нібы птах
З палоскі сялянскае вузкае.
Адзін толькі ведаў ў жыцці сваім шлях –
Пачэсны, цяжкі, беларускі!

На другім здымку – Ларыса Геніюш каля помніка, дзе відаць агароджа, бетонныя слупкі. Уверсе – трубка з нержавейкі, уваход да помніка, замест веснічак – ланцужок, які з аднаго боку здымаецца. Сам помнік быў выраблены ў Навагрудку, агароджа – сябрамі ў Баранавічах. Ні сын, ні ўнукі ўдзелу ў пабудове надмагілля не прымалі, праўда, здымак Івана Пятровіча прывёз сын з Беластока. І трэці здымак – Геніюшы на сваім ганку ў Зэльве на Савецкай вуліцы, 7а. Цяпер ганак мае зусім іншы выгляд, і зусім не падобны на той, які быў пры жыцці гаспадароў.

Жыццёвы шлях Івана Пятровіча Геніюша вельмі добра апісала Ларыса Антонаўна ў сваёй „Споведзі". Але „Споведдзю" яна тады не называлася, а проста я папрасіў Ларысу , каб яна напісала сваю аўтабіяграфію. Вось вытрымка з яе ліста да мяне 14.09.1976 года: „Просьбу тваю я выканаю, але на гэта, каб напісаць аўтабіяграфію, трэба крыху часу. Давядзецца табе пачакаць". Калі на наступны год я прыехаў у Зэльву, Ларыса Антонаўна паказала мне першых 90 лістоў надрукаваных на машынцы. Яна сказала: „Можаш пачытаць і забраць". Я адказаўся і папрасіў пакінуць напісанае да наступнага майго прыезду, калі запашуся пазітыўнай плёнкай і зраблю, што трэба. Пачуўшы нашу размову, Іван Пятровіч дадаў: „Што там надрукавана, магчыма, важней за ўсе яе вершы". І калі я прыехаў зноў і спытаў пра абяцанае, Ларыса Антонаўна адказала: „Усё тое напісанае знаходзіцца ў надзейных руках". Я болей нічога не пытаўся, бо для мяне ўсё было зразумела.

А цяпер крыху пра самога Янку. Іван Пятровіч вельмі любіў кнігі, купляў іх сам і прасіў у сяброў, каб тыя куплялі і прысылалі ў Зэльву. Калі я жыў у Комі АССР, ён мне ў кніжнай лаўцы ў Зэльве падпісаўся на Беларускую Савецкую Энцыклапедыю. І калі паступалі першыя тамы, то дасылаў мне ў Комі. Трымаў заўсёды сабаку, які быў прывязаны на ланцужку і ноччу бегаў ад ганка да хлява па нацягнутым дроце. Вельмі шкадаваў, калі здохла аўчарка Альма, якая была першым дэгустатарам цукерак, смятаны, якую прыносілі суседзі, што і было прычынай яе смерці. Іван Пятровіч, пасля звароту з Варкуты ў 1956 годзе, працаваў лекарам у Зэльвенскай раённай паліклініцы. У яго кабінеце вісеў партрэт Францішка Скарыны. Многія хворыя, якіх ён прымаў, пыталіся: хто гэта на партрэце? Доктар Геніюш з усімі размаўляў толькі на беларускай мове. Часта чуў, як хворыя, стоячы ў чарзе перад дзвярыма казалі: „З лекарам размаўляйце толькі па-беларуску, інакш не дасць бюлетэню". Калі на вуліцы з Янкам віталіся па-руску, то ён рабіўся глухім і нічога не адказваў, калі ві-

таліся па-беларуску, то Іван Пятровіч здымаў з галавы капялюш, нізка кланяўся і адказваў: „Дзень добры!". Хадзіў ён з ляскай, бо меў хворыя ногі, якія ў апошнія гады жыцця пухлі. Прымаў хворых і дома, быў вялікі практык па неўралогіі, сексалогіі, венерычных захворваннях, ведаў добра хірургію і тэрапію, а таксама лячэбныя травы. Адным словам, дапамог многім зэльвенцам у нядуга, людзі яго вельмі цанілі.

З першага жніўня 1976 года Янку звольнілі з працы і адправілі на пенсію. Спачатку ён нерваваўся і перажываў. „Я ж была рада, што нарэшце будзе дома сядзець", – пісала мне Ларыса. Янку далі 84 рублі і 8 рублёў яшчэ выдзелілі на Ларысу, і таго разам атрымалася 92 рублі на дваіх. Трэба было купіць дровы, дарагія лекі Янку. А ў канцы снежня 1976 года Ларыса лезла на гару, паслізнулася драбіна і разам з ёю паляцела ўніз. Жанчына зламала нагу і пакалечыла руку. Ёй наклалі гіпс. І вось – абое хворыя. Янка нічога гатаваць не можа. Па ваду да студні хадзіць далекавата. Людзі баяліся дапамагаць, праўда, толькі школьнікі прыходзілі і дапамагалі. Янка час ад часу выходзіў на ганак, як казала Ларыса, пагрэць на сонцы нос. Відаць было, як штомесяц ён марнеў. І хутка для яго наступіў апошні дзень жыцця.

Апошні дотык рук на твары чую,
Тваіх знямоглых, цяжкасхвараваных,
Апошні раз мой муж мяне цалуе,
З невысказаным да канца каханнем.
Залегла грозна цішыня у хаце,
Не вымавіць таго, што чуе сэрца,
Хвораму целу з ложа не падняцца,
Няўмольна смерць суровая крадзецца.
Як воск ад свечкі, памаленьку тае,
Малы агеньчык, ужо амаль не свеціць,
Смерць, быццам злодзей, моўчкі падступае,
Што ж, усё яшчэ смяротнае на свеце…
О колькі раз я на тваіх далонях,
Выплаквала свой горкі боль да рання,
Як затрымаць жыццё тваё мне сяння,
Усё не дасказана шчэ, не дакахана.
Не адлятай ў нязнаную дарогу,
Не пакідай, каб сэрца не балела,
Здаецца мне, што дзён гэтак нямнога,
Пражытых разам мігам праляцела…
Прайшлі гады, а для мяне хвіліны,
Супольных мараў, сноў аб Беларусі,
Ў нас дзве душы, а шлях наш быў адзіны,
Як жа цяпер сама я застануся?..

Была адпраўлена паніхіда ў царкве, шмат было народу, вянкоў ад розных гарадскіх прадпрыемстваў і арганізацый, музычнай школы. Памятаю, чысцілі ад снегу дарогу да могілак бульдозерам. Сын прыехаў з Беластока з усёй сям'ёй. Былі сябры з Мінска, Баранавіч, Гродна, Полацка. Не прайшло і тыдня пасля паховінаў, як камуністы пачалі рабіць свае чорныя справы. Адзін сваяк Янкі, ужо не малады, але камуніст (прозвішча не памятаю), нёс наперадзе драўляны крыж, то за гэта атрымаў вымову і аштрафавалі яго на 50 рублёў. А дачка ягоная была настаўніцай у школе, дык ёй прапанавалі напісаць заяву і дабравольна адказацца ад працы ў школе, інакш звольняць з „воўчым білетам".

Ларыса Антонаўна тады напісала добры ліст да Пятра Машэрава і звярнулася, як да настаўніка і кіраўніка дзяржавы, каб паспачуваў і нейкім чынам падзейнічаў на гарадскіх самадураў. Але яе ліст не апусцілі ў паштовую скрынку ў Зэльве, інакш ён не трапіў бы ў рукі Машэраву. А знайшліся людзі, якія аддалі пісьмо ў прыёмную Машэрава. Адказу на ліст Ларыса не дачакалася. Але меры былі прыняты. Нехта інкогніта прыехаў у Зэльву, даў добрага наганяю ўсім у гаркаме партыі, і ўсё стала на сваё месца: настаўніца засталася на працы, а той, хто нёс крыжа, рэабілітаваны.

Дарагі Сяргей, апрацуй гэты ліст належным чынам, як лічыш патрэбным для сябе. Жадаю поспехаў і моцнага здароўя.

З павагай –

Мікола Канаш, 11.03.1996 г.

Добры дзень, Сяргей Мікалаевіч!

Вялікі дзякуй за ліст і за беларускі тыднёвік „Ніва" з Беластока. Прыемна было ў думках сустрэцца з далёкай мінуласцю. Дзякуй Вам за тое, што вялікую справу робіце для нашай грамадскасці. Але трэба спяшацца, бо губляюцца сілы і зарастаюць сцежкі даўняй мінуласці…

Я ў сярэдзіне сакавіка захварэў, падхапіў інфаркт сэрца, ледзь выкарабкаўся, але і зараз адчуваю сябе неякавата, крыху хаджу каля хаты, прымаю лекі.

Пра Сямёна Раманчука амаль нічога не ведаю. Чуў, што ў Слоніме ці ў Гародні ёнканчаў школу падхарунжых. Быў шчырым беларусам. У Інце працаваў на паверхнасці, жыў у зусім іншым бараку ад шахцёраў. Думаю, што больш падрабязна пра яго зможа расказаць Пётра Рашэтнік з Баранавіч, пра якога я пісаў раней. Не так даўно ён мне званіў і казаў, што ляжыць у шпіталі з сэрцам. Цяпер, магчыма, ужо дома. Ён жыве адзін у кватэры, жонка памерла. Я Вам паведамляў, што з ім у Ларысы Геніюш у Зэльве я быў шмат разоў, а ў лагеры за спатканне з Ларысай атрымалі па 15 сутак ізалятара.

Пра Міхася Вітушку я нічога ніколі не чуў.

Дам Вам, Сяргей, яшчэ адзін адрас былога сталінскага нявольніка з Інты, які працаваў увесь час на паверхнасці і зараз жыве недалёка ад Вас. Але адразу хачу папярэдзіць, што ён можа не адразу пойдзе з Вамі на кантакт. Гэтага хлопца павінен ведаць і В.Супрун, які яго прыгадвае ў сваіх успамінах: 223710 г. Салігорск, Паркавы завулак, 26/13. Агейка Міхась.

Wielka Kletna – królewskie uroczysko

Dawnymi czasy, kiedy Puszcza Białowieska nie była jeszcze podzielona na oddziały, czyli kwadraty lasu o jednowiorstowej długości boku, miejscowa ludność, dla lepszej orientacji w terenie, nadawała poszczególnym partiom puszczy wyróżniające je nazwy. Po pocięciu Puszczy w połowie XIX wieku na oddziały, które w późniejszym okresie rozdrobniono jeszcze na tzw. ćwiartki, nazewnictwo leśnych uroczysk, o dziwo, nie ustało. Szczególnie dużo nowych nazw pojawiło się w okresie międzywojennym, kiedy Puszcza była intensywnie eksploatowana. W tym też okresie kierownik Parku Narodowego w Białowieży, Jan Jerzy Karpiński, postanowił spisać, przy pomocy leśnej administracji, wszystkie puszczańskie uroczyska. Sporządzony przez niego wykaz liczy ponad tysiąc pozycji.

Szereg zapisanych przez J. J. Karpińskiego nazw wyszło już z użycia. Z różnych powodów. Czasem związane było to ze zmianą sposobu użytkowania danej połaci lasu, innym razem przyczyna leżała w zatraceniu głównej cechy wyróżniającej uroczysko. Zdarzało się i tak, że o starej nazwie zapominano, gdyż nie stało już ludzi, którzy się nią na co dzień posługiwali. Następne pokolenia nadawały swoje nazwy. I w ten sposób proces nazewniczy nigdy nie ustaje.

Są jednakże w Puszczy uroczyska, których nazwy trwają od wieków. Pokryte patyną czasu, stały się one swoistymi słupami milowymi w puszczańskim nazewnictwie. Do takich uroczysk bez wątpienia należy Wielka Kletna (Wielkie Kletno).

Uroczysko to znajduje się na terenie Białowieskiego Parku Narodowego, u źródeł rzeki Orłówki (dawniej nazywanej Jelarką bądź Jelanką). Swą nazwę wzięło od istniejącego tutaj w drugiej połowie XVI wieku pierwszego znanego nam w Puszczy Białowieskiej ogrodzonego zwierzyńca (ogród do polowania), założonego za czasów króla Stefana Batorego (panował on w latach 1576-1586). Zwierzyniec ten znajdował się w granicach dzisiejszych oddziałów 374 i 375, położonych na północ od Drogi Browskiej. Istniała też Mała Kletna (Małe Kletno lub Kletnoje), która z kolei znajdowała się w oddziale 402, położonym na południe od Drogi Browskiej. W XVI wieku na terenie Puszczy Białowieskiej istniała jeszcze jedna zagroda łowiecka – Teremiska (obecnie obszar ten zajmuje Ośrodek Hodowli Żubrów Białowieskiego Parku Narodowego).

Stefan Batory urządził w Puszczy Białowieskiej wielkie łowy w dniach 7-10 stycznia 1581 roku, przed wyprawą na Psków. Polowano na żubry i inną zwierzynę. W tym samym czasie dla króla zbudowano dwór myśliwski w dzisiejszym uroczysku Stara Białowieża. Jako ciekawostkę można podać, że w 1583 roku, po raz pierwszy w dziejach Puszczy, na polecenie Batorego, odłowiono w królewskim zwierzyńcu dwa żubry, z których – jeden został przewieziony do zwierzyńca w Warszawie, drugi zaś trafił do zwierzyńca w Krakowie.

O pierwszym zwierzyńcu w Puszczy tak wspomina Aleksander Połujański w drugim tomie „Opisania lasów Królestwa Polskiego i gubernij zachodnich Cesarstwa Rossyjskiego pod względem historycznym, statystycznym i gospodarczym” (Warszawa 1854): „W każdej puszczy wybierano dogodne miejsce na przesmyk zwierząt, ogradzano je parkanem i płotem, aby zwierz uciec nie mógł, zewnątrz zaś tego parkanu naokoło budowano dla dostojnych myśliwych ozdobne altany, z których do zwierząt bezpiecznie strzelać mogli. Taki zwierzyniec był w puszczy Białowieskiej, w dawnej straży Brow-



Z: G. Karcow – Biełowieżskaja Puszcza”, 1903

Król Stanisław Poniatowski na polowaniu w Puszczy Białowieskiej w 1784 roku

skiej, blisko źródeł rzeki Jelarki, gdzie część pięknego lasu dębowego, otoczona niegdyś parkanem i płotami, zowie się dotąd zwierzyńcem królewskim albo wielką kletnią. Oprócz tego było kilka innych zwierzyńców (m.in. w Knyszynie i Olicie)".

Z kolei Michał Baliński i Tymoteusz Lipiński w trzecim tomie „Starożytnej Polski pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym opisanej" (Warszawa 1846) podają następującą informację o białowieskim zwierzyńcu: „(...) w straży zaś Browskiej, blisko źródeł rzeki Jelarki, część pięknego lasu zowie się Zwierzyniec Królewski, albo Wielką Kletną. Jest to wielki i suchy ostęp zarosły odwiecznymi dębami, które najwdzięczniej bluszcz obwija; otaczają go parkany i płoty, bo tam spędzano zwierzęta, które królowie ubijali z altan umyślnie w tym celu zbudowanych".

W XVIII wieku, za panowania królów Augusta II i Augusta III, zwierzyniec Wielka Kletna został ponownie odnowiony i najpewniej poszerzony. Zaczęto go nazywać Augustowym Sadem, Augustowskim Sadem lub Ogrodem Królewskim. Na współczesnych mapach zaznacza się to uroczysko w oddziałach 345 i 346. Nietrudno zauważyć, że graniczy ono od północy z Wielką Kletną.

W dniach 30 i 31 sierpnia oraz 1 września 1784 roku w Augustowym Sadzie polował król Stanisław August Poniatowski. Było to już ostatnie królewskie polowanie w Puszczy Białowieskiej. Dla króla wybudowano duży, trzykondygnacyjny drewniany pawilon. Parter w nim zajmowała służba, pierwsze piętro mieściło dużą izbę przeznaczoną dla króla, wysłaną kobiercami i dywanami, zaś najwyższe piętro było odkrytym balkonem, skąd można było oglądać polowanie. Pawilon znajdował się od północnej strony zagrody, przy zbiegu płotów (szyi matni). Sama zagroda miała kształt wieloboku przypominającego nieco elipsę podzieloną na pięc wewnętrznych zagród. Podobno ślady pawilonu i płotu były widoczne do końca XIX wieku. W naszych czasach po zwierzyńcu żadnych śladów już nie da się dostrzec. Przetrwał on jedynie w nazwie. Natomiast przeprowadzone w 2003 roku przez Instytut Archeologii i Etnologii PAN w Warszawie i Zakład Badania Ssaków PAN w Białowieży prace archeologiczne w uroczysku Wielka Kletna wykazały w


Fot. Tomasz Niechoda

W uroczysku Wielka Kletna można spotkać kilkusetletnie dęby, które „pamiętają" czasy królewskiego zwierzyńca

nim ślady znacznie wcześniejsze – odkryto bowiem cmentarzysko ciałopalne z przełomu II i III wieku n.e. Znalezisko to należy do kultury wielbarskiej, utożsamianej z ludem Gotów, którzy wędrowali ze Skandynawii, m.in. przez Podlasie i teren Puszczy Białowieskiej, nad Morze Czarne.

Piotr Bajko

Eugeniusz Czyżewski

Echa Ostoi Utraconej

40. W miasteczku już wojsko jest, strażnicę tu zorganizowali. Budynki rzeźni teraz koszarami są. Jest tam z pięćdziesięciu żołnierzy i dwóch oficerów. Posterunek milicji znowu czynny, bo poprzednio czemuś istnieć przestał. Mówiono nawet, że byli milicjanci teraz do nieznanych należą, bo ktoś podobnych w lesie widział. Nowi posterunkowi z wojskiem do wsi przychodzą, idą, rozglądają się, próbują z wieśniakami rozmawiać, ale ludzie ich unikają, by w nocy z rozmowy nie tłumaczyć się. Milicja nie ściga nieznanych, strażnica też nie. Jedni i drudzy nie atakują siebie i z drogi schodzą. Bywa i tak, że wojsko i milicja ochrania urzędników z powiatu, gdy ci zebranie wiejskie robią i o władzy robotników i chłopów mówią. Na zebraniach tych również przybysze są, a i pojedynczych nieznanych widać, i nic się nie dzieje. Miastowi odjechali, we wsi poprzedni porządek panuje. Jest jednak obowiązek meldowania o najściach nieznanych i band rabunkowych, też pod groźbą kary za zatajenie, coś podobnego do tej groźby z okupacji niemieckiej, tyle że nie grożą rozstrzelaniem. Ten urzędnik, co mowę na ten temat głosił, nieznanych i nocnych wszystkich bandami nazywał. Ostrzegał, że władza je zlikwiduje i zeznania od likwidowanych mieć będzie, a każdy kto im sprzyja, z karą się spotka. Ludzie boją się, że w nocy mogą pro-

wokatorzy przyjść, tak jak do tego felczera gestapowcy, by rodzinę rozstrzelać za niemeldowanie o odwiedzinach. Dotychczas odróżniano tu bandy rabunkowe, które brały i nie tłumaczyły się, od tych, co niby „dobrowolne" datki brały, w nocy przez okno, nie mówiąc już o grupach dużych umundurowanych i uzbrojonych. Groźba kar za pomocnictwo na wieśniaków zeszła i to kar od władzy z miasta i władzy z lasu. Jedni i drudzy karą grożą. Groźniejsi są jednak ci z lasu, bo sędzia i kat razem chodzą. Większość przybyszów ze wsi uciekła, z powrotem na ziemie niemieckie wyjechali. Listy do dziewcząt piszą z propozycją małżeństwa, bo tam gdzie są, dziewcząt mało. Uciekli, bo podobno tu neutralnym być nie można. Kizior też gdzieś odszedł, ale Czarny jeszcze jest i to chyba on swoje wojsko rozbudowuje. Rozga na karteczce ostrzega, że dziewczyny do tych dezerterów jechać nie powinny, że pójście w ślady dezertera jako zdrada zostanie policzone i rodzice nie mogą im córek dawać.

Zakaz konspiry do młodzików schodzi. Zyga Malinka lat 17 ledwie ukończył, ale gdy samogonu potrzebuje, gospodarzom o potrzebie wódki dla wojska prawi i ją dostaje. Widywano też nielatów ze wsi sąsiedniej, jak na drogach rozstajnych wieczorami ludzi przeszukiwali. Na sucho im to nie uszło i z posterunku milicji z obitymi siedzeniami powrócili. Okazało się, że milicja pierze nie słabiej jak przedwojenna policja, ale i czyn tych podlotów nie byle wybrykiem był.

Zyga nie jest ścigany. Widocznie ten samogon dla kogoś władnego nosi, a że przy okazji sobie pozostawia, to chyba „wojskowym" nie przeszkadza. Praporszczyk Zygę laską zdzielił i bez haraczu wygnał. Na drugi dzień jednak do miasteczka ze wsi do siostry wyniósł się, bo jeden z przybyszów z rana sam po wódkę przyszedł i pięść mu do nosa przystawił. Haracz wódczany nałożył, Baj ma mieć wódkę w pogotowiu i będzie ją dawał na każde zawołanie. Nawet nie osłaniał nałogu potrzebami szpitala polowego. Wszyscy wiedzieli, że przybysze często biby urządzają, a do walk żadnych tu nie dochodzi, to i rannych chyba nie ma. Brak władzy samosąd uruchamia. Wieś lincz przeżyła na mieszkańcu swoim dokonany. Kazka od Francuza zabito za to, że zamordował ojca i matkę swoją. Morderca ten to siedemnastoletni chłopak, za Niemca las rąbał. Mocarzem jednak nie był, postura słaba, blady jakby krwi pozbawiony. Rodziców pozabijał, bo według jego mniemania byli przeszkodą do ożenku z dziewuchą hożą, ich sąsiadką, która akurat z Niemiec wróciła. Biegał za nią, przykrość jej czyniąc, bo co to za kawaler natrętny, który jeszcze mężczyzną nie jest. W tradycji wsi mężczyzna za rodzinę odpowiada, a za co wyrostek taki odpowiadać może. Dziewucha coś tam żartowała, natręta od siebie goniąc. Ktoś tam słyszał, jak mówiła, że jego rodzice na ślub im nie pozwolą, więc niech jej nie dokucza. Ta plotka po wsi krążyła, niby współwinną zbrodni dziewczynę czyniąc. Wszyscy wiedzieli, że winna ona nie jest, ale nie musiała o rodzicach wspominać. Powinna inaczej go odpędzić, choć nikt nie mówił, co trzeba było zrobić.

Kazek ojca zastrzelił w warsztacie, gdy ten ul majstrował, przez okno strzelił, a później wraz z rodziną winnego poszukiwał. Francuz, człowiek we wsi szanowany, zgodny we współżyciu, wśród stałych mieszkańców wroga nie miał, z nikim w żadnej zwadzie nie pozostawał. Podejrzewano, że jakiś przybysz go zabił, bo i strzał z broni, a i od tych ludzi każda przyjść może. Do władzy zawiadomień nie dano, by tu jakieś śledztwo wykonała, groźba nieznanych skutkowała. Niczego więc nie wyjaśniono i tak dwa miesiące zeszły. W niedzielę z rana Kazek matki po sąsiadach szuka. Kobieta zaginęła, wypadek niebywały, gdzieś pójść mogła, ale dokąd. W kościele jej nie ma, dopiero śniegi zeszły, w polu prac żadnych, a w dodatku niedziela. Policjant niemiecki, Kazek Chłodny, śledztwo prowadzi, zaginiona jest jego ciotką. Kobietę z rozbitą głową w chlewie, tam gdzie owce stoją, w gnoju zakrytą znalazł. On już wie, że to jego kuzyn imiennik matkę zabił. Mordercę do klamki drzwi wejściowych do domu przywiązał i pierwszy w niego kamieniem rzucił. Kazek dzień cały poobijany na klamce wisiał, spaleniem wsi groził, zabiciem tych, co w niego kamienie rzucali. Gdy ciemności dzień kończyły, policjant go dobił. Taczka taka na podwórku stała, uniósł ją do góry i czaszkę Kazka rozgniótł.

Matka na cmentarzu z udziałem wsi przy mężu spoczęła, a jej syn i morderca za ogrodzeniem cmentarza zakopany, bez nagrobka leży.

Wieś żyła dalej jakby w cieniu tej zbrodni. Emocje opadły, pozostała świadomość, że kiedyś władza do tej sprawy wróci i zapyta, jak to się odbyło, kto i w jakim zakresie do linczu się przyczynił. Rozmowy na ten temat ustały. Wszyscy umilkli, nikt nie mówił, co konkretnie zrobił albo widział, nie powtarzał wypowiedzi zasłyszanych.

Leon, starszy brat zamordowanego, w tym czasie w Białymstoku żył. Do wsi już nie powrócił, zagroda pusta z czasem istnieć przestała. Kazek zbrodniarzem i ofiarą czasu jest. Wojna w rękę pistolet mu dała, a trupy zabitych wojaków, które jako dziecko oglądał, zagrożenie ciągłe z ręki człowieka uzbrojonego, śmierć tych ludzi w okolicy najbliższej, znieczulenie na cudzą biedę hodowała. On do sumienia swojego już nie sięgał. Potrafił żyć po zabiciu ojca, potrafił na matkę siekierę podnieść, więc cóż dla niego inne życie znaczyło. Los ludzki, jak ludzki nie od pracy i uczciwości zależał, drapieżność, rabunek, siłowe usuwanie przeszkód drogę życia otwierało i może dlatego do tych zbrodni tu doszło.

Kazek – policaj niemiecki, a obecnie główny sprawca linczu, też gdzieś o śmierć się ocierał. Podobno zastrzelił partyzanta sowieckiego, czy tylko jednego i czy tylko partyzanta, a do kogo strzelał, gdy Warszawę szturmował razem z Niemcami. On też jakby ze swoim sumieniem nie kontaktował. Rozbił czerep kuzyna i żyje jak inni, ta krwawa masa na drzwiach wisząca nie prześladuje go, a przecież zanim policajem został, był to wrażliwy chłopak wiejski.

Władza z miasta referendum ogłosiła. Do wsi wojsko cywilnych agitatorów przywiozło. Sołtys zebranie obwołał, Rotę odśpiewano. Śpiew nawet ładnie brzmiał, a pan porucznik powiedział, że słychać tu starego żołnierza. W pierwszym rzędzie znowu ojciec sołtysa niemieckiego siedzi i jak kiedyś tematy z agitatorem i oficerem znalazł. Mówili o tym, jakie to korzyści dla państwa z Ziem Odzyskanych i zniesienia senatu będą, ale i o rozdziale ziem obszarników i zabraniu przez państwo fabryk burżujom. Wszystko to już się stało, władza tylko chce, by ludzie powiedzieli tak: „Dobrze zrobiliście i my was popieramy". Porucznik mówił, że jak wieś powie tak, to i bandy znikną, bo ci co wieś nachodzą, mówią nie temu co zrobiono i spór o to we wojnę zamienił się. Wieśniacy uważali, że jak ziemie niemieckie już mamy i nasi tam jadą, to dla kogo one mają być, jak nie dla Polski. Senatu też nikt nie żałował, bo tam ważni panowie siedzieli i podatki na ich utrzymanie trzeba było płacić, a teraz tego nie ma i dobrze. Wieś z podziału majątku korzyści nie miała, a fabryk żadnych tu już nie ma, to i nie wsi to sprawa, chociaż to niby sprawiedliwiej, jak wielu korzyść ma zamiast jednego. Teraz majątek pana ze setka chłopów obrabia i ekonom nad nimi nie stoi i żniwiarek – dziewcząt młodych pośladki nie szczypie.

Agitator zapewniał, że kołchozów w Polsce nie będzie, bo majątkową ziemię dzielą nie po to, by ponownie ją scalać. Niby to i prawda, ale tak do końca wiary brak, bo wieś kołchozu się boi.

Niespodziewanie stary August taką mowę dał, że całe to referendum niepotrzebne jest, bo ziemię niemiecką już mamy, majątki rozparcelowane i po jaki czort te pytania. A senatu nie ma, to widocznie niepotrzebny. Chłopa pytać o takie sprawy to jakieś nieporozumienie. Stara kobieta wiejska ma decydować o tym, gdzie ma Polska sięgać, jak są tu i takie, co nigdy w Białymstoku nie były i tylko kilka razy w Sokółce, a i mapy nie widziały. Szkoda zachodu w takiej sprawie i pieniędzy państwowych, lepiej niech tu nauczyciela dadzą, bo analfabeci tu rosną. Cywilny agitator ponownie coś tam mówił, ale gorszy on mówca od Augusta i zebrani pamiętali, co August powiedział. Maciej Rozga niespodziewanie dla Augusta w ulotce swej pochwałę mu dał za odważne odrzucenie referendum. Tak to August w politykę nos wsadził, jak sam to komentował, czasami język wrogiem człowieka jest. Rozga jednak na jednej ulotce nie poprzestał i w kolejnych Augusta za przykład oporu chłopa wobec „bolszewicko-demokratycznej" władzy stawiał. Martwiło to Augusta i zaklinał się, że już nigdy na żadnym zebraniu nic nie powie.

Wojsko zaczęło w nocy zaglądać całymi kompaniami i na kilkudniowe postoje też. Nocnych uzbrojonych bywalców chcieli złapać, ale tak się działo, że jak wojsko we wsi kiszoną kapustę i ogórki chłopskie jadło, to nocny tu nie zaglądał. Wojsko na postojach koszarowych porządek dnia przestrzegało, rano pobudkę grano, gimnastyka nawet gdy zła pogoda, wieczorem apel z modlitwą. Z mieszkań chłopskich wychodzili, wybiegali niczym z izby żołnierskiej. Mówiono, jakie to wojsko komunistyczne, jak modlitwę głosi. Żołnierze mówią, że z Łodzi, Poznania, Pomorza są. Na pobór stawili się i służą, bo tak trzeba. Poznaniacy dziwią się, że tu taki bałagan, że jacyś ludzie bandy organizują, ludzi grabią, szantażują. Wojska jest dużo, do Polski z frontu dywizje wróciły, a te grupy zbrojne, co tu ludziom dokuczają, to żadna siła zwarta. Każdy wódz na własną rękę działa, bo Armię Krajową już w styczniu 1945 r. rozwiązano, a pojedyncze grupy zbrojne wojska nie rozbiją. *Cdn*

Успаміны з 1979 г.

2. 16 ліпеня Садам Хусейн стаў прэзідэнтам Ірака.

17 ліпеня Дыктатар Нікарагуі Л. Самоса ўцякае ў ЗША, а 19 ліпеня паўстанцы Сандыністычнага фронту захапілі сталіцу Манагуа і стварылі свой новы ўрад.

25 ліпеня прыехала да нас на наша запрашэнне з Сарн другая стрыечная сястра маёй жонкі Ніны, Тамара Панько, у якой мы былі ў 1978 г. і праз некалькі дзён паехала яна разам з маёй жонкай Нінай у Згажэлец да сястры яе бацькі. Як я ужо пісаў, яе бацьку Васіля Некрашэвіча разам з яго сястрой савецкі НКУС вывёз ў 1941 г. у Казахстан, а пасля вайны яны вярнуліся ў Згажэлец. Бацька Тамары памёр у Згажэльцу, а жыла яшчэ тады яго сястра з дачкой. Тамара і Ніна паехалі ў Згажэлец, пабачылі магілу Васіля Некрашэвіча і сустрэліся там з яго сястрой. Пасля Ніна з Тамарай вярнуліся да нас у Варшаву і Тамара паехала ў Сарны. Васіль Некрашэвіч у Казахстане ажаніўся з полькай Янінай, ды яна пасля смерці мужа ў Згажэльцу пераехала жыць у Бельск - Падляшскі і перапісвалася з Тамарай, а нават з маёй жонкай.

Калі Ніна ездзіла з Тамарай у Згажэлец, я працаваў у Варшаве.

2 жніўня у Познані я сустрэў вечарам у гасцініцы ,,Паланез" савецкую экскурсію з Масквы, якая прыехала аўтобусам „Саўтрасаўта" з ГДР, раздзяліў ім пакоі і з'еў з імі вячэру. На наступны дзень пасля снедання экскурсавод з Познаня іх аўтобусам павёз і паказаў ім горад, з ратушай і касцёлы ў Познані і прывёз іх у гасцініцу на абед. Пасля абеда паехаў я з імі ў бок Варшавы і аглядзелі мы замак і парк у Курніку, а пасля замест у Варшаву я завёз іх згодна з планам у Лодзь у гасцініцу „Гранд" па вул. Пятроўскай і раздаў ім пакоі ды з'еў з імі абед. Да вячэры яны мелі вольны час. На наступны дзень экскурсавод з Ло-

дзі паказала ім горад з касцёламі і праваслаўнай царквой Аляксандра Неўскага пабудаванай у 1884 г. і Батанічны сад. Пасля абеда я завёз іх у Варшаву ў гасцініцу „Гранд" па вул. Кручай, дзе далі ім пакоі і вячэру. У сувязі з тым, што на наступны дзень я мусіў рана ехаць на тэхнічную канферэнцыю ў электрастанцыю Казяніцы, я перадаў групу савецкіх турыстаў майму сыну Георгію, які таксама, як я, закончыў курс гідаў . Ён іх на наступны дзень пасля снедання з варшаўскім экскурсаводам вазіў і паказваў ім Варшаву і пасля абеда з імі развітаўся. Я падвечар вярнуўся з Казяніцаў.

Пасля сын мой Георгій у палове жніўня сам паехаў цягнікам на запрашэнне ў Сарны, дзе сустрэла яго Тамара Панько. Ён жыў тыдзень у іх на кватэры, вазілі яго ў Роўна, а пасля ён цягніком з Сарнаў паехаў у Ленінград да Таццяны Фармакоўскай і Алены Кірэевай на Канюшны перавулак. У Ленінградзе правёў ён два тыдні і вярнуўся цягніком у Варшаву.

27 жніўня баевікі Ірландскай рэспубліканскай арміі ў паўночнай Ірландыі забілі 18 англійскіх салдат.

7 верасня ад урагана„Дэвіл"у Дамініканскай Рэспубліцы гіне 100 людзей.

16 верасня Х. Амін скінуў прэзідэнта Афганістана Нура Таракі і сам стаў прэзідэнтам дзяржавы, што не спадабалася СССР, бо яго падтрымліваў Кітай.

З 29 верасня па 1 кастрычніка папа рымскі Іван Павел ІІ быў з афіцыйным візітам у Ірландыі.

У электрастанцыі Казяніцы сінхранізавалі з электрычнай дзяржаўнай сеткай астатні дзесяты блок прадукцыі СССР магутнасці 500 мегаватаў і я ўжо рэдка туды ездзіў. Электрастанцыя Казяніцы цяпер мае магутнасць 2880 мегаватаў і з'яўляецца самай магутнай электрастанцыяй у Польшчы на каменны вугаль. Амаль кожны тыдзень ездзіў я з іншымі праекціроўшчыкамі машынай „Энергапраекта" на адзін дзень на электрастанцыю Белхатаў, дзе будавалі будынак і мантавалі першы блок (кацёл, турбіну, генератар і трансфарматар) польскай прадукцыі на буры вугаль магутнасці 380 мегаватаў. Велічэзныя землячарпалкі выкідвалі пясок і гліну, дабіраліся да бурага вугля на глыбіні некадькі дзесяткаў метраў, мантавалі канвеерныя транспарцёры, якія пасля будуць вазіць выкапаны буры вугаль на склад ля электрастанцыі. Будавалі каміны і халадзільныя ўстаноўкі.

23 кастрычніка шах Ірана ўцёк у ЗША на лячэнне.

Мы раней пазнаёміліся з сям'ёй Марыі і Уладзіміра Каліноўскіх, беларусаў з Беласточчыны, якія жылі на другім баку вул. Чэрнякоўскай. Ён, як юрыст, добра ведаў нямецкую мову і працаваў у нейкай арганізацыі ААН у Вене ў Аўстрыі і вельмі часта прыязджаў у Варшаву, а восенню на зіму забіраў жонку, сына і дачку ў Вену, дзе меў асобную кватэру, два пакоі з кухняй і ванным пакоем. А нас ужо некалькі год запрашала да сябе немка Ціна Блянк з Бад Райхенгаля ў Баварыі, з якою мы пазнаёміліся ў 1974 г. на пляжы ў Дуброўніку. Я з ёй перапісваўся з таго часу. І вось я з Нінай рашылі ў лістападзе паехаць да яе. І Марыя Каліноўская запрасіла нас да сябе ў Вену, калі мы будзем ехаць у Бад Райхенгаль. Мелі мы затрымацца ў іх, калі будзем ехаць у Бад Райхенгаль і калі будзем вяртацца дамоў. Польскія ўлады далі нам пашпарты, а пасольствы Аўстрыі і Нямеччыны далі нам візы. Заходнюю валюту я меў на сваім доларавым рахунку ў польскім банку ПКА. Пры Герку кожны грамадзянін Польшчы мог купіць на чорным рынку заходнюю валюту і закласці рахунак з заходняй валютай ў польскім банку. ПКА і калі выязджаў у капіталістычныя дзяржавы, мог вывезці яе афіцыйна за мяжу. Мы выкупілі чыгуначныя білеты да самага Мюнхена і з Мюнхена ў Варшаву. З Варшавы ў Вену і з Вены ў Варшаву выкупілі мы спальныя месцы, а далей толькі сідзячыя.

12 кастрычніка вечарам селі мы ў спальнае купэ цягніка Варшава-Вена, Ніна на ніжнюю, я на сярэднюю полку. Верхняя полка была пустая да самай Вены. У кастрычніку была ўжо халаднавата і Ніна забрала з сабой футру з нутрый, а я асенняе паліто. На граніцы з Чэхаславакіяй польская мытніца хацела спачатку запісаць Нініну футру ў мытную дэкларацыю, аднак паверыла Ніне, што яна яе не мае намеру прадаць і не запісала. У Вене нейкі яўрэй прапанаваў Ніне заплаціць за футру 6 тыс. аўстрыйскіх шылінгаў, ды Ніна не захацела яе прадаць, бо было холадна і трэба было б купіць паліто. У Браціславе, калі ранкам цягнік стаяў доўга на вакзале, Ніна выйшла з вагона і ўбачыла, як да нашага цягніка прычапілі два выгоны з савецкімі яўрэямі, якія з Сібіры групай ехалі праз Аўстрыю ў Ізраіль. Нават гутарыла па-руску з нейкімі бедна адзетымі яўрэямі. Ехалі яны цэлымі сем'ямі ў гэтых вагонах. Ранкам прыехалі мы ў Вену на паўднёвы вакзал Зюдбангоф. Марыя Каліноўская сказала нам у Варшаве, якім аўтобусам з вакзала даедзем да вуліцы, пры якой яны жывуць. І мы лёгка туды даехалі. Жылі яны ў цэнтры Вены недалёка ад пляцу Сцяпана. Там мы з імі сустрэліся і атрымалі ў іх кватэры аддзельны пакой з шырокім тапчаном. Пераначавалі мы ў іх дзве ночы і самі хадзілі па Вене.

Пасля снедання агледзелі мы прыгожы гатычны сабор св. Сцяпана з вежай 135 м., з якой відна панараму Вены, пабачылі звонку парламент пабудаваны ў 1847 г., ратушу, пасля паехалі і агледзелі палац Бельведэр з прыгожым вялікім паркам з алеямі ды з прыгожымі клумбамі, фантанамі і статуямі ўздоўж іх. Вярнуліся на абед, а пасля паехалі ў музей Альберціна, дзе агледзелі яго галерэі і рукапісы, і вярнуліся на вячэру і начлег.

14 кастрычніка з тэлефона на

вуліцы на манеты я пазваніў у Бад Райхенгаль Ціне Блянк і паведаміў яе, што заўтра выедзем цягнікам з Вены і пасля абеда будзем на вакзале ў Зальцбургу. Яна абяцала, што будзе там нас чакаць і забярэ нас да сябе.

Пасля паехалі мы паглядзець звонку палац Хофбург, дзе да 1918 г. жылі аўстравенгерскія імператары, а пасля абеда знайшлі мы на вул. Jauresgasse 2 прыгожы пяцікупальны, высвячаны яшчэ ў 1899 г. рускі сабор Мікалая Цудатворцы з залачонымі купаламі, які належаў Маскоўскаму патрыярхату. Сабор, аднак, быў закрыты. На дзвярах было напісана, што вячэрняя служба ў саборы будзе вечарам, ды мы не маглі чакаць. Прайшліся па вуліцы, пабачылі каталіцкі невялікі касцёл, дзе сустрэлі дзве польскія манашкі. Пабачылі, што праваслаўны сабор стаіць не вельмі далёка ад паўднёвага вакзала і рашылі прыйсці ў яго, калі будзем вяртацца ў Варшаву. І мы паехалі на начлег на кватэру да Каліноўскіх.

На наступны дзень паехалі мы цягнікам у вагоне з сідзячымі лаўкамі у Зальцбург. Там на вакзале сустрэлі мы нашу знаёмую Ціну, з якой прайшлі праз мытны кантроль. У нас толькі спыталсяі мытнікі, колькі маем польскай гарэлкі і ў багаж не заглядвалі. На нямецкім баку селі мы з Цінай у электрычны цягнік і даехалі да вакзала ў Бад Райхенгаль, а з вакзала да яе дома дабраліся на таксі.

Ціна мела двухпавярховы домік. Нас пасяліла на другім паверсе ў вялікім пакоі, які абаграваўся газам. Побач нашага пакоя быў ванны пакой з ваннай і душам і туалетам. Сама Ціна жыла на першым паверсе, дзе былі яе вялікі пакой, сталовы пакой, яе спальня і яе ванны пакой. Побач яе дома стаяў другі падобны дом, у якім жыла яе дачка Герлінда з мужам Пэтэрам. Яна нядаўна выйшла замуж. Дзяцей у іх не было. Дзесяць дзён мы былі на Ціціным утрыманні.

Ціна была аўстрыйскай немкай з-пад Зальцбурга і выйшла замуж за немца з Бад Райхенгаля. Муж яе папаў у савецкі палон на усходнім фронце і вярнуўся вельмі хворы і ў 1970 г. памёр, аставіўшы ёй дачку. Ціна была ўдавой-пенсіянеркай і, відна, мела добрую пенсію, калі кожны год ездзіла на заграгічныя экскурсіі. Была не толькі ў Югаславіі. Была ў Італіі, Грэцыі, Іспаніі. Дачка яе працавала санітаркай у санаторыі. Бад Райхенгаль гэта горад курортаў, які ляжыць у даліне, акружаны горамі Альпамі. Калісь у ім дабывалі чыстую соль і цяпер там у санаторыях лечаць людзей у саляных растворах.

На другі дзень на запрашэнне Ціны прыйшла яе сяброўка Рута Рабольд, якая так слаба ведала польскую мову, што мы мусілі дамаўляцца толькі на нямецкай мове. Ніна вывучала ў сярэдняй школе нямецкую мову і хаця гаварыла па-нямецку горш ад мяне, аднак добра з імі дагаварвалася па-нямецку і нам перакладчыцы не было трэба.

Першы дзень абышлі і пабачылі мы прыгожы горад. Дамы там былі памаляваныя яркімі колерамі, на дамах часта былі намаляваныя фігуры людзей. Магазіны ўсе ўжо рэкламавалі тавары на свята Божага Нараджэння. Аглядзелі мы Бертэргарднер – музей і звонку многія санаторыі, дзе ў саляных ваннах і басейнах купаліся курортнікі.

Перад рэвалюцыяй прыязджалі сюды багатыя рускія людзі і таму пабудавалі тут невялікую праваслаўную царкву. Аднак у апошнюю вайну бамбілі Бад Райхенгаль англа-амерыканскія самалёты, і, відна, бомба разбурыла праваслаўную царкву, аднак дах ад яе з купалам і праваслаўным крыжам выратавалі і ляжаў ён на зямлі ля адной з вуліц як рэлікт астатняй вайны.

На наступны вечар запрасіла нас на вячэру дачка Ціны Герлінда. Зазнаёміліся мы з яе мужам Пэтэрам, які быў адвакатам. У размове з ім я адчуў, што ён захапляўся А. Гітлерам, якога армія дайшла аж на Каўказ, хяця прызнаваў, што многа злога зрабіў ён для Нямеччыны. Пасля прыйшоў яго бацька Ганс, які быў судэцкім немцам. Яго чэхі выгналі з Чэхаславакіі. Гаварыў, што хяця яму добра жывецца ў Баварыі, аднак тужыць за Судэтамі. Калі я сказаў, што хочам паехаць і пабачыць Мюнхен, ён запрапанаваў нам, што паедзе разам з намі і пакажа нам славутасці Мюнхена.

Перад Мюнхенам паехалі мы з Цінай і Рутай у Берхтэсгадэн ля возера Хімзее і там аглядзелі мы вельмі прыгожы палац караля Баварыі Людавіка II Шалёнага (1845-1886).

З Гансам ранкам паехалі мы цягнікам у Мюнхен і з вакзала ён узяў таксі і завёз нас спачатку ў бенедыктынскі манастыр Андэкс і завёў нас у іх піўную на піва і сыр, які вырабляюць манахі і яго прадаюць. А пасля паглядзелі мы манастыр.

Пасля завёз нас на Стары горад, на Marienplatz, на якім стаіць мармуровая фігура Марыі Дзевы і блізка прыгожая ратуша з фігурамі каралёў, герцагаў і святых, і 85-цімятровая вежа з гарадскім гадзіннікам. Прывёз ён нас сюды перад 11 гадзінай, каб пабачылі мы а 11 гадзіне, калі зайграюць куранты і пакажуць прадстаўленне. Фігуры тады пачынаюць рухацца і паказваюць спектакль. Пасля аглядзелі мы сабор Святога Пятра і Святога Духа. Большасць жыхараў Баварыі лічыць сябе каталікамі, у адрозненні ад іншых немцаў, якія з'яўляюцца пратэстантамі. Далей ён паказаў нам Ізарскіе вароты з дзвюма вежамі і касцёл Прасвятой Багародзіцы. За адзін дзень многа не пабачыш, аднак мы ўдзячныя былі яму, што з намі паехаў, таму што мы самі таго б не пабачылі. Пасля поўдня завёў нас у рэстаран і заплаціў за абед. Не хацеў, каб мы плацілі. А на вечар вярнуліся мы цягнікам у Бад Райхенгаль.

На наступны дзень Ціна завезла нас фунікулёрам на гару Пэдых-

штуль (1 583 м.), адкуль мы агледзелі панараму Альпаў, а пасля завяла нас у рэстаран на гары на абед. У рэстаране было многа немцаў, якія паводзілі сябе вельмі гучна.

25 кастрычніка з Цінай рана паехалі мы у Зальцбург, каб аглядзець перад выездам у Вену горад. На граніцы мытнікаў не было і мы пакінулі багаж ў багажнай скрынцы на вакзале ў Зальцбургу і разам з Цінай гулялі па горадзе. Аглядзелі мы напачатку цікавыя вітрыны ў магазінах, пасля дом дзе нарадзіўся і жыў кампазітар Вольфганг Моцарт, сабор, фантаны, а потым фунікулерам паехалі на гару Фестунг (119 м), дзе на другім беразе ракі Зальцах увайшлі мы ў старую крэпасць з 1077 г. Хоэнзальцбург. Якраз прыехала туды экскурсія з Сербіі і мы разам з ёй аглядзелі пакоі замка, карціны ў крэпасці. Калі вярнуліся на вакзал, развіталіся сардэчна з Цінай і паехалі цягнікам у Вену да Каліноўскіх. З Цінай я перапісваўся да 2003 г. Амаль штомесяц я атрымоўваў ад яе розныя паштоўкі з краявідамі з яе экскурсій і пісьмы. Прыслала мне некалькі кніг з краявідамі, я ёй таксама высылаў на нямецкай мове кнігі з краявідамі з Польшчы і Петрапаўлаўска ды Ленінградс. Ціна была старэйшая ад нас. Колькі яна мела год, яна нам не сказала і я яе не пытаў. Калі перастала пісаць, я зразумеў, што яна ўжо не жыве. З дачкой яе Герліндай я не перапісваўся. Ад Ціны ў пісьмах я даведаўся, што Герлінда ўзяла развод з Пэтэрам. Аб прычыне разводу Ціна мне не напісала.

26 кастрычніка ад Каліноўскіх паехалі мы пабачыць палац і парк у былой рэзідэнцыі Габсбургаў у Шэйнбрун. Абышлі мы вельмі прыгожы парк з клумбамі кветак і статуямі на пастаментах. Сустрэлі мы там беларускага спявака з-пад Магілёва, які там спяваў і зарабляў шылінгі спевам. Аб ім я напісаў пасля верш ,,Беларускі Арфей”, які ўвайшоў у мой зборнік вершаў ,,Струмені лёсу”. Там падышла да нас, пачуўшы нашу мову, былая масквічка з дачкой, якая выйшла замуж за румына з Бухарэста і цяпер яны паехалі аглядаць Еўропу. Былі ва Францыі два тыдні, а цяпер прыехалі ў Вену ў Аўстрыю. Разам з імі мы купілі квіткі ў палац Габсбургаў і яго разам з імі аглядзелі, а пасля развіталіся. Яны далі нам свой адрас у Бухарэсце, а мы ім свой у Варшаве і нейкі час я з імі перапісваўся, аднак больш ніколі з імі не сустрэліся.

Вечарам паехалі мы на вакзал, закампасціравалі чыгуначныя білеты, атрымаўшы спальныя месцы ў вагоне, схавалі багаж у багажныя скрынкі і пайшлі пехатой у праваслаўную царкву на вячэрню. На вячэрні разам з намі было 11 асоб. Пасля вячэрні пехатой ноччу вярнуліся мы на вакзал і пасля паехалі цягнікам у Варшаву. На чэхаславацка-польскай граніцы польская тамажніца вельмі здзівілася, што раней польская тамажніца не ўпісала ў тамажнюю дэкларацыю Нініну футру і што яе прывезла назад. 27 кастрычка вярнуліся мы дамоў.

12 лістапада прэзідэнт ЗША за захоп амерыканскага пасольства ў Тэгеране ўводзіць эмбарга на пастаўку іранскай нафты.

30 лістапада адкрылі шырокарэйкавую чыгуначную лінію ў Гуту Катавіцэ з усходу, каб з СССР можна было давезці жалезную руду.

2 снежня натоўп людзей ў Трыпалі ў Лівіі спаліў пасольства ЗША.

27 снежня савецкае войска ўвайшло ў Афганістан, а фактычна ўжо 25 снежня а 7 гадзіне ў районе горада Тэрмеза савецкія салдаты пачалі будаваць пантонны мост і а 15 гадзіне перайшлі граніцу, а ваенная транспартная авіяцыя пачала перакідваць паветра–дэсантныя дывізіі на аэрадромы ў Кабуле і Баграма. Высадзілі там 7700 дэсантнікаў і баявую тэхніку. 27 снежня савецкія дэсантнікі захапілі многія будынкі ў Кабуле і забілі прэзідэнта Афганістана Г. Аміна і зрабілі прэзідэнтам Б. Кармалю. Пачалася вайна ў Афганістане, якая працягвалася да 15 лютага 1989 г. У 1979 г. у Афганістане згінула 86 савецкіх салдат. Аднак СССР не прасіў сваіх саюзнікаў, як гэта робяць цяпер ЗША, каб яны высылалі сваіх салдат на падмогу ў Афганістан ці раней у Ірак.

(Працяг будзе)

Дзмітрый Шатыловіч

Крышынкі

Васіль Петручук

57. Цёці – цёткі – цётачкі. Я ўжо ў сваіх „Крышынках” прабег, значыць, пераскочыў, бы воўк праз гару па дзядзьках, дзядзінах, бабулі і дзядулі. Але ў такім сэнсе, як складаліся мае адносіны да цётак і цётак да мяне (дзве цёткі родныя сёстры маёй мамы) не паказаў. Гэта вельмі дрэнныя справы, якія могуць у вачах чытачоў паставіць мяне ў некарысным выглядзе. Але з другога боку, калі я не скажу пра цётак праўды для іх некарыснай хаця б з большага, дык не да канца будзе ўбачаная мая жыццёвая трагедыя сярод зусім нябедных сваякоў з выключэннем наймалодшай цёткі, якая была ў сваіх бацькоў, братоў і братавых служанкаю, але і ёй там хлеба не бракавала. А калі выйшла замуж, то сам стала гаспадыняй і мела што есці.

Можна было б прамаўчаць як прамоўчвалася многа іншых па-

дзей, але я сёння падумаў, што многія са сваякоў і так бокам на мяне глядзяць, дык няхай хаця чужыя людзі пачытаюць і задумаюцца над існаваннем кагосьці такога як я. А мне ўжо ўсё роўна, за адну нагу вісець, ці за дзве. Мо каму і не падабаецца бедаванне над пройдзеным, але для мяне яно ніколі ў жыцці не дало спакою. І то спакою не толькі таму, што так да мяне адносіліся іншыя, колькі таму, што я быў такім дурылам. І вось у канцы майго жыцця хачу каб яшчэ і аб гэтым людзі прачыталі і ніколі не былі такімі як я, бо такіх як былі ў мяне мае сваякі, у тым ліку і родныя сёстры маёй мамы і з Ворлі сястра майго бацькі, аб якой я ўспамінаў, як калісьці святам Пятра і Паўла прыйшла да нас у госці і прынесла мне ў падарунку выграбаны з сумкі кавалачак засмечанай костачкі цукру. Ён мне хутка растаў у роце і я не паспеў нацешыцца салодкім, а толькі выплюнуў астаўшыеся на языку крышынкі смецця. А я будучы ўжо афіцэрам прыехаў памагчы ім (цётцы і яе мужу) жаць жыта. А раз едучы праз Ворлю затрымаўся самаходам у іх ад акном. Калі выйшаў з машыны, цётка выглянула праз акно і ўбачыўшы мяне крыкнула: „Ой, якія дорогій гуосцьць, чым я ёго почестую?” – „Здрайствуйте, тётя, мэнэ нычым нэ трэба частоваты, бо я нэ голодны” – „То я тобіе дам ядёр” (семак з дыні). Мы крышку пагаварылі і я развітваючыся пытаюся: „То куолькі, тёто, я вам выноваты за ядра?” (была іх торбачка ад цукру). „Ат, дай 60 злоты і хватыт” – адказала бацькава сястра і я паехаў. Гэта была цётка Марыся, бяздзетная асоба.

Цяпер пра цётку Устынку. Будзем яе так называць, як у вёсцы ўсе яе называлі. Гэта тая цёця, аб якой я ўспамінаў, калі пісаў пра тое, як бег у Шалешак шукаць коней познім вечарам, а яна ішла з тахвілаўскага поля, бо аж у Тавілаўцаў Масальскія мелі свой участак, і спаткаўшы мяне на Панфілюковай дарожцы спыталася, куды я іду нанач. А даведаўшыся куды, здзівілася, што такога малога бацька пасылае па коней. „Мой Полік мае ўжо дванаццаць лет і то яго шкадуем, – сказала, – а тэбе такога малого і так пуозно высылают по коны!” І пайшла. Таму я памятаю, што тады было мне шэсць гадоў, бо цёцін Полік быў старэйшы за мяне на шэсць гадоў.

І вось, не знай не ведай, летам 1956 года вяртаюся я з горада і ў сваёй кватэры застаю цётку Устынку з двума сынамі. Несмешлівы мой лёс наказаў мне выходзіўшы ў горад не зачыняць кватэру, а гэта магло стаць прычынай не толькі таго, што ўвашлі неспадзяваныя госці, але ў мяне часта так здаралася і здараецца.

Я не магу сказаць, што вітанні нашы былі сардэчныя, а проста такія грабавецкія: Яны ведалі чаго да мяне едуць, а я здагадваўся, што буду мець якісьці абавязак і пытаюся: „З чым добрым вы да мяне з’явіліся?” А цётка бесцырымонна кажа: „У Грабувці говорат, шчо ты вэліка шышка, то мы прыехалі, коб зняв з нас податок. Бо дванаццать ліет нэ плачу, то грозят мныэ вэлікою карою.!” – „О, тёто, – гавару са смехам – каб такія „шышкі” як я знымалі падаткі, то ў Пуольшчы ныхто нэ платыў бы. Я ныяка нэ шышка, шчо сам можу, але навэть нычого спульного з податкамы нэ маю. То можэ вам зробыты Міністэрство скупу і контрактацыі...” – „То як сам нэ можэш, то вэзы нас до того міністэрства!” – падарвалася з крэсла цёця.

Я тады працаваў у спецсувязі і хадзіў у мундзіры КБВ. Папрасіўшы ў палкоўніка Едлінскага вольнага часу, сказаўшы, у чым справа, ды адразу раніцай павёз я маіх гасцей (дагэтуль не ведаю, чаму цёця ехаўшы да мяне ўзяла з сабою аж двух сыноў?) да міністэрства шукаць ратунку. Заязджаем туды, а там столькі народу, што немагчыма ўступіць за парог. Я злякаўся не на жарты і не ведаю, што тут зрабіць. У прыёмную міністра ўпускае якісьці ягоны рэферэнт. Пасля нейкіх дзвюх-трох асоб выходзіць з прыёмнай і кліча па „прозвішчы” пана афіцэра. Я бачу, што акрамя мяне няма тут ніякага афіцэра, бяру цётку за руку і прапіхаюся да яго. Ён просіць людзей, каб нас прапусцілі і дадае: „Proszę, proszę, panie poruczniku” і мы праціснуліся да дзвярэй. Рэферэнт пытаецца ў мяне, у якой мы справе, а я яму гавару, што мая цётка прыехала ў справе падатку. Ён адчыняе дзверы і запрашае.

Уваходзім і я выручаю цётку ў яе шматслоўі і на сваёй мове і коратка гавару: „Panie ministrze, ciocia zalega z płaceniem podatku, ponieważ jest biedną wdową i posiada dużą rodzinę, więc przyjechała prosić pana ministra o umorzenie zaległości”. – „Proszę pana, – пачынае міністр, – pan wyłuszczył mi krótko po wojskowemu sytuację pańskiej cioci, to i jak krótko się do niej ustosunkuję. Ja nie mogę, nie mam prawa umorzyć podatku nie ukarawszy osoby niepłacącej dwudziestodniowym aresztem. Jeśli pani się na to godzi, to nie ma sprawy, – кончыў міністр. Я пытаюся: „Як, тёто, згодны?” – „То чом, як нэма другого выходу, то шчо ж мныэ двадцэть дён одсэдыты за дванаццэть ліэт – згодна!”.

Візіт у міністра не працягваўся больш як дзесяць-пятнаццаць хвілін. Выходзячы з прыёмнай, я падзякаваў рэферэнту за такую вялікую дапамогу, а ён папрасіў маё прозвішча і адрас. Цёця з сынамі Іванам і Юрыем паехала дамоў, я атрымаў нейкае задавальненне, што цёця выбрала такі выхад з сітуацыі. А ці мела іншы на ультыматум міністра? Цётцы (не ведаю, як яе дзецям) напэўна прыкра было за народнай улады ісці ў турму за падатак, калі са саветаў яна была Маці-гераіня за выгадаванне васьмярых дзяцей.

Падвечар гэтага ж дня прыходзіць да мяне пачцівы чалавек рэферэнт МСіК (Міністэрства скупкі

і кантарктацыі) нібы спытацца, ці цёця ад'ехала задаволенай, але ж вядома ў чым справа; адной кавай спатканне не абышлося. Расставаліся мы як прыяцелі, але на наступную сустрэчу не дамовіліся. Тым часам *спустя*, як расіяне гавораць, мой прыяцель па цётчынай справе зноў мяне наведаў, нібыта будучы службова ў раёне. Зноў не абышлося без пачастунку на чале з гарэлкай. Але паўлітроўкі было замала, дык рэферэнт запрапанаваў, каб наведаць рэстаран каля кіно „В-З". Там мой госць беспардонна заказаў дзве соткі, дзве порцыі селядцоў. Падчас размовы быў вясёлы і гаваркі, ды ў сваіх жэстах часта кранаў мяне рукой то за пячо, то за сцягно. Я як туман-туманавіч нічога аб нічым не ведаў. І толькі даведаўшыся аб схільнасцях нейкіх людзей ад жонкі, здагадаўся, чаму ён са мною такі мілы, а не пайшоў ні разу патанцаваць з жанчынай. Але мяне такая сітуацыя не зацікавіла і не насцярожыла. Я нічога не быў свядомы і хіба не верыў, што нешта такое існуе сапраўды.

Аж прыйшоў дзень калі чаргловы, ужо не ведаю каторы раз наведаў мяне мой калега, бо ўжо мы былі на „ты". Была нядзеля і мы гасцявалі. Я пайшоў у кухню па хлеб, а мой госць за мною; схапіў мяне за шыю і давай цалаваць. Я яго адапхнуў і сказаў, што калі ён не хоча авантуры і каб я яго не выганяў з хаты, няхай паводзіць сябе па-чалавечы, каб мая жонка не палапалася ў чым справа. Ужо ў іншай сітуацыі дапілі мы гарэлку і ён пайшоў ад мяне. Пасля яшчэ наведваў пару разоў, але ўжо толькі пры каве і не гэтым наша „дружба" кончылася. Але я аб гэтым ніколі нічога нікому не гаварыў. А далёка пасля аказалася, што цётцы на ўсё гэта было напляваць, калі б нават ведала, што я перажываю менавіта з-за яе.

(Працяг будзе) ■

Popołudnia filozofów

Drugi cud nad Wisłą

Tego dnia zbiegły się gwiazdy nad Warszawą i otoczyły wieńcem chwały anielicę prawa moralnego, która się wzniosła ku nim na skrzydłach ludzkich pragnień. Gwiazdy nie lśniły najczystszą jasnością ani skrzydła nie grzeszyły najwyższą mocą, ale zawsze to było wydarzenie niezwykłe. Ludzie otwierali szeroko oczy, by móc objąć nimi skalę zjawiska i zadawali sobie pytanie, czy i tym razem chodzi tylko o złudzenie, czy jest to już cud prawdziwy.

Przyjaciel, który znalazł się w domu Profesora jeszcze tego samego popołudnia, przybył tam wyraźnie podniecony i od razu przystąpił do udowadniania, że mamy oto do czynienia z czymś zgoła niepojętym, gdyż nawet on, człowiek praktyczny i trzeźwy nawet po dużym winie, nie jest w stanie przyjąć do wiadomości, że nie ma w tym nic nadzwyczajnego, że można i tę sprawę olać po warszawsku „Polacy, nic się nie stało." A stało się, bo dla Polaka usłyszeć, że Rosjanie są dla nas przyjaciółmi i braćmi, to jest jak trzepnąć głową w mur historii.

– Moje prawo moralne wychynęło ze mnie i zobaczyło nad sobą nieboskłon gwiaździsty – zwierzał się Przyjaciel przed Profesorem niemal z zachwytem. – Bo któż to tak powiedział? Zwierzchnik Kościoła katolickiego w Polsce! Do zwierzchnika Cerkwi prawosławnej w Moskwie i całej Rosji! Istny cud nad Wisłą!

Profesor nie podzielał entuzjazmu Przyjaciela. Wspólne Przesłanie o potrzebie pojednania, tak uroczyście podpisane na Zamku Królewskim w Warszawie, dla niego było wydarzeniem poważnym, otwierającym jaśniejsze horyzonty dobrosąsiedzkiego współistnienia. Ale by mogło nabrać znaczenia zaiste historycznego, ów „mur historii", o którym wspomniał Przyjaciel, wydawał mu się nazbyt trwały, by można go było obalić jedną deklaracją. Instytucje publiczne, mające upowszechniać tę ideę dialogu i porozumienia, działały niemrawo, kaznodzieje Kościoła, który pretendował do przewodnictwa ekumenii, okazali się bardzo powściągliwi w głoszeniu tej swoistej „dobrej nowiny". Jednak emocjonalną gorączkę Przyjaciela przyjął z życzliwą aprobatą.

– Chcesz mnie ująć, Przyjacielu, poezją filozoficznych wizji – powiedział. – To miłe w chłodzie współczesnej myśli poznawczej. Jestem tu z tobą, bo to jest zapewne ciekawsza droga do prawdy niż przedzieranie się przez naszą siermiężną historiozofię.

Zatrzymał się na chwilę, po czym dorzucił: – Ale czy bardziej skuteczna?

– Nie wiem – przyznał Przyjaciel, wzruszając ramionami w geście nieoczekiwanej bezradności. Opowiedziałem ci to, co przyszło mi do głowy, kiedy zobaczyłem, jak ciepło próbuje się brać w ramiona „braci Moskali".

– Nie po raz pierwszy – zauważył Profesor. – Z mizernym przecież skutkiem. Ale jakiś krok w dobrą stronę został uczyniony, to fakt.

– Milowy krok! – ożywił się ponownie Przyjaciel. – I w bardzo dobrą stronę!

– Kiedyś nasi biskupi wystąpili z prośbą o wzajemne przebaczenie do swoich kolegów niemieckich – przypomniał mu Profesor. – I co? I nic. Katolicy katolików po prostu olali, jak zwykłeś się wyrażać.

– Ale to jest wspólny apel o pojednanie! – zawołał Przyjaciel. – Podpisali go hierarchowie religijni, ale niejako w imieniu swoich narodów! Przed wielomilionową masą telewidzów! I to zabrzmiało jak przysięga, że odpuszczamy sobie wzajemnie winy i patrzymy ufnie w przyszłość pod czujnym okiem Najwyższego... I to jest cud, przy naszych fobiach istny cud!

Profesor aż się uśmiechnął pobłażliwie.

– To już drugi cud nad Wisłą – podkreślił rzeczowo. – Dwa dni wcześniej świętowaliśmy nasze zwycięstwo pod Radzyminem. Nic nie wybaczając.

– Tamto było niemal sto lat temu!

– No właśnie...

– Co właśnie?

– ...i wciąż się odprawia msze nienawiści...

Przyjaciel westchnął i rozejrzał się za szklaneczkami.

– To karykatura polskości – westchnął po raz drugi. – Przyniosłem szampana, żeby wznieść toast za Polskę jasną jak sierpniowe lato.

Profesor wystawił smukłe kieliszki.

– Lato się skończy i zacznie się jesień.

– Polska jesień!

– „Jesień dla Polaków to pora żałobna...”.

Huknął korek, wyskakując z butelki i huknął Przyjaciel na przyjaciela:

– Przestań, panie sceptyk! Polska to złota jesień!

Eugeniusz Kabatc ■

Ахраматычныя беларусы

Размова з мастак-дызайнерам Міхалам Анемпадыставым

1. **Чым зараз займаецца Міхал Анемпадыстаў, выдатны дызайнар, мастак і творца беларускай культуры?**

– Я займаюся цяпер у першую чаргу дызайнам, та візуальным, як антрапалагічным. Гэта значыць апроч праектавання нейкіх аб’ектаў альбо графічных твораў я спрабую разабрацца ў тым як выглядае беларуская культура. Калі візуалізаваць беларускую культуру, я спрабую зразумець як яна выглядае. Які ў яе стыль, якія каноны існуюць. Што такое для ўмоўнага, статыстычнага, ідэальнага беларуса, якога няма ў прыродзе, панятак прыгожага. Гэта складана вербалізаваць, я ніколі пра гэта не думаў. Спрабую нарэшце разабрацца ў тым, адшукаць і выявіць аблічча беларускай культуры.

З аднаго боку ёсць напрацоўкі і апошнім часам людзі гэтым займаюцца, вывучаюць. На прыклад драўляная архітэктура альбо беларускі ручнік, ткацтва. Неяк так атрымліваецца, што ўсё гэта фрагментарна. Кожны даследуе свой фрагмент. У выніку маем раз’яднаныя візуальныя помнікі ці каноны, стылі. Архітэктура гэта адно, ткацтва зусім іншае. А мне цікава, каб гэта ўсё нейкім чынам паспрабаваць усё ж такі спалучыць. Дзе за што чапляецца, што з чаго вынікае. Ці ёсць нейкія ўніверсальныя законы і каштоўнасці, якія працінаюць усю побытавую беларускую культуру. Калі коратка – гэта мяне апошнім часам найбольш цікавіць.

Калі канкрэтызаваць, то гэта вялікі праект, якім я ўжо даўно займаюся, ён называецца „Колер Беларусі”. Я падумаў, што колер па сабе з’яўляецца невербальнай мовай. Кожны народ мае прэферэнцыі адносна колеру. У розных культурах адным падабаюцца тыя колеры, другім іншыя. Мне было цікава разабрацца з тым, якім колерам аддае перавагу гэты ўмоўны беларус. Якія колеры зачапіліся ў беларускай культуры, засталіся і якія самі сталі часткай гэтай культуры. І адпаведна ўся гісторыя. Чаму менавіта гэты колер палюбіўся беларусамі. Як ён патрапіў на Беларусь, якія мае ўплывы. Ясна, што мы жывем не ў ізаляваным космасе. Мы кантактуем з суседзямі, мы нешта ад іх пазычаем, нешта суседзі нам праз нашае жаданне навязваюць і мы гэта з цягам часу пачынаем успрымаць як сваё. Гэта мяне цікавіла. У выніку паўстаў праект „Колер Беларусі” з візуальнай падборкай, гэта значыць фотаздымкі і розныя артэфакты з тэкставай часткай.



Міхал Анемпадыстаў (fot. facebook.com)

Які колер Беларусі?

– Інтрыга маёй працы на тым палягае, што я не выношу ў назву колер, а хутчэй задаю пытанне пра колер Беларусі, не называючы які. Мне цікава, каб кожны сам паспрабаваў адказаць на гэтае правакатыўнае пытанне. Што тычыцца мяне асабіста, я лічу, што колер Беларусі гэта шэры.

Шэры не асацыюецца зараз добра. Гэта сімвалічна крышку абыякавы...

– Безумоўна, шэры мае зараз перадусім негатыўныя адценні. Як сінонім ці сімвал нуднасці, беспрасветнасці. Але калі капаць глыбей, заўважце, што ў беларускай вербальнай традыцыі шэры колер пазітыўны. Усе татэмічныя жывёлы, надзеленыя нейкім сакральным значэннем – яны ўсе шэрыя. Яны не існуюць без дадатку гэтага колеру. Каза, якая нясе дабрабыт, урадлівасць. Коцік шэрэнькі, ваўчок. Мышка шэрая, якая хвосцікам разбівае залатое яйка. Уся гэта казка вельмі касмалагічная. Шэрая галка якая прыносіць залатыя ключы ад зямлі на Юрыя, які адчыняе імі зямную расу.

Усе гэтыя жывёлы шэрыя невыпадкова. У дадзеным выпадку гэта колер утульнасці, бяспекі, у нейкім сэнсе мяккасці і цяпла. Калі я менш займаўся напрацоўкамі якія існуюць наконт псіхафізічнага дзеяння колеру, я думаў што шэры колер апроч таго што ён з'яўляецца ў нейкім сэнсе нудным, смутным нават. Я ўпэўнены, што ён апроч гэтага яшчэ супакойвае як колер нейтральны. Бо ён па-першае ахраматычны, то значыцца ён па-за межамі спектральнага кола паміж белым і чорным, ён не раздражняе. Таму ў пэўным сэнсе ён нясе спакой і пачуццё бяспекі.

Для беларускай культуры ўжыванне колеру ў побытавай культуры, у інтэр'еры, было вельмі абмежаванае. Фактычна ўвесь гэты побыт складаўся з нефарбаваных матэрыялаў. Дрэва, гліна якая толькі часам тэхналагічна задымлялася. У нас амаль няма каляровай, паліўной керамікі. Найболей распаўсюджанай была натуральная, якая залежыць толькі ад колеру гліны. Бясколернасць якраз характэрная для традыцыйнай культуры. Дарэчы, пра гэта шмат хто піша. Ян Булгак у сваёй кнізе „Край дзіцячых гадоў" некалькі разоў звяртае ўвагу чытача што традыцыйны беларускі дом нефарбаваны. Дрэва з цягам часу робіцца шэрым. Гэтае ён спрабуе аналізаваць, акрэсліць так званы шляхецкі стыль і сялянскую эстэтыку. Некалькі разоў сцвярджае ў гэтай кнізе, што гэтая натуральнасць, інтэграванасць у прыроду, з'яўляецца адной з характэрных рысаў шляхецкага і сялянскага дома.

Каб яшчэ больш падкрэсліць, а можа чыста са сваіх нейкіх уласных псіхічных успамінаў, некалькі разоў прыводзіць прыклад, калі расійскія памешчыкі прыязджалі на Наваградчыну. А якраз у канец XIX стагоддзя мы ведаем, што маёнткі рэквіраваліся ў мясцовай шляхты і прадаваліся расійскім памешчыкам. Яны прыязджалі і пачыналі жыць на Беларусі са сваімі расійскімі густамі і законамі. Ён прыгадвае, як яны прыязджалі і старасвецкі дом фарбавалі якой-небудзь зялёнай ці блакітнай фарбай. Альбо дах фарбавалі, што для яго было абсалютна непрыемлівым. З дзяцінства ён быў гэтым шакаваны.

Такі дом вылучаўся, быў бачны здалёк.

– Шчыра кажучы, я не ведаю з якой мэтай расіяне гэта рабілі. Думаю што рабілі з вельмі простай мэты. Яны думалі, што гэта было прыгожа. Важна што для тутэйшага жыхара Наваградчыны гэта было непрыгожае. Тут мы сустракаемся з канонам традыцыйнай культуры. Прыгожае тое што было перад намі. Так заведзена і гэта прыгожа. Не робіцца аналіз, чаму падабаецца. А падабаецца таму, што гэта традыцыя. Расіяне са сваёй традыцыяй ясна не ўпісваліся і для малога Яна Булгака тое што яны фарбавалі дах, гэта было непрыгожае. І для бацькі яго было непрыгожае. Казаў яму: „Глядзі які жудасны азіяцкі колер!". А сёння бачым, што спрэс па Беларусі на змену гэтай традыцыі калі натуральны дах то дрэва не фарбуецца, а прыходзяць вельмі яркія колеры і спалучэнні.

То бок зараз мы гэта прынялі ў эстэтыцы.

– Я думаю, што адказ іншы. Мы прынялі некаторыя расійскія традыцыі, напрыклад ужывання сіняга і блакітнага колеру ў экстэр'еры. Гэта траыдцыя расійская і нават ведаю адкуль яна з'явілася ў самой Расіі. Тое ж самае зялёны колер. Фарбаванне дамоў на цёмна-зялёны колер. Таксама расійская традыцыя, яна не такая старая, усё яго XIX стагоддзе.

Гэта не зусім ненатуральны колер. Цёмна-зялёны колер бывае ў прыродзе.

– У прыродзе бывае, так. Толькі тут гаворка не пра тое што колер падбіраецца пад фарбы прыроды. Гаворка пра тое, што матэрыялы маюць свой прыродны колер. Традыцыйным для беларусаў было нічым не фарбаваць, пакідаць такім якім ёсць.

Фарбаванне будынкаў алейнымі фарбамі звязанае з некалькімі момантамі. Тым што яны з'явіліся ў шырокім продажы і сталі таннейшымі, можна было сабе дазволіць пафарбаваць. Тое што ў XIX стагоддзі ў Расіі ўзнікла некалькі плыняў архітэктурных і ў дэкаратыўным мастацтве, якія спрабавалі зрабіць свой расійскі стыль. У архітэктуры ажно тры такія стылі існуе – так званы рускі–візантыйскі, неарускі стыль па прыкладзе паўночнай расійскай архітэктуры. Ёсць так званы псеўдарускі стыль. Ён такі казачны, цeрамочны, на мяжы з безгустоўнасцю і кічам, але гэта падабалася людзям найболей. І вось гэты псеўдарускі стыль як найбольш дэкаратыўны, распаўсюдзіўся з вялікай хуткасцю на агромнай тэрыторыі. Захапіў нават Беларусь і Беласточчыну. Усе гэтыя карнізы, налічнікі, рэзьбяныя, карункавыя элементы, дэкор – гэта адгалоскі расійскага стылю якога найбольш яркім архітэктарам быў Іван Рапэт.

Ідэолагамі псеўдарускага стылю была група вельмі таленавітых мастакоў і дзеячаў мастацтва на чале

з Аляксандрам Бенуа (група „Мир искусства”). Абодва браты Васнецовы, Мікалай Рэрых і яшчэ шмат. Вядома што існавала два галоўныя асяродкі – сядзіба недалёка Смаленска, а другі каля Масквы. Абрамцава, здаецца. Яны шмат чаго прыдумалі, намалявалі проста з галавы, з пальцаў. Прайшоў рускі стыль гуляць. Зрабіўся модным. Яны бралі ўдзел у парыжскіх выставах і там ён таксама пакаціў. І ў Еўропе ўзнікла, перадусім у Францыі, мода на „ля рюс”. Ён паўплываў, ясна. У XIX стагоддзі патрапіў на Беларусь таксама. Спачатку праз расійскіх прадстаўнікоў. Пазней стаў часткай традыцыйнай культуры. А на Беласточчыне яшчэ больш дзіўная гісторыя. Тут трэба браць пад увагу тое, што шмат людзей было эвакуіравана падчас першай сусветнай вайны.

Так, у бежанства. Ёсць такое меркаванне, што ў 1915 годзе, калі выехалі ў глыбінку Расіі, тады там захапіліся. Вярнуліся і пачалі так будаваць. Вялікія вокны і гэтак далей. Гэта быў – як вы кажаце – псеўдарускі стыль?

– Перадусім колькасць драўляных разных упрыгожванняў. Аканіцы таксама нехарактэрныя. Тут нават бачна, што калі пераязджаеш мяжу Беларусі ў Польшчу. Гарадзеншчына стылёвая ці не больш заходняя чым Беласточчына, якая яшчэ далей на захад. Ну і гэтае спалучэнне таксама сіне-блакітнае. Яно па-першае ўвогле нееўрапейскае. У Еўропе не спалучаецца колеры падобныя. Сіні і блакітны, ружовы і чырвоны напрыклад. Еўрапейская традыцыя гэта кантрастныя спалучэнні. На Беларусі вельмі актыўнае ўжыванне двух колераў сіняга і блакітнага ў апошнія гады, гэта не так даўно з’явілася. Яно стала распаўсюджаным. Перадусім у рэгіёнах, дзе праваслаўе. Бачым Беласточчыну, цэрквы. Гэта іррацыянальнае спалучэнне.

У Бельску Міхайлаўская царква. Там спалучэнне блакітнага з сінім – шалюнак і аканіцы. Адкуль гэта бярэцца, з якой культуры?

– Гэта характэрнае для арыентальнай культуры. Яна каларыстычная, вельмі шырока спалучае колеры недапусцімыя для традыцыйнай еўрапейскай культуры, якая выходзіць з аднаго боку з антычнай грэцкай каларыстычнай традыцыі, а другая, гэта антычная рымская традыцыя.

Блакіт у беластоцкай традыцыі перадусім у сакральных пабудовах. На Беласточчыне сіне-блакітны колер з’яўляецца ў нейкім сэнсе маркерам нацыянальнай ідэнтычнасці. Альбо па крайняй меры маркерам канфесійнай, праваслаўнай ідэнтычнасці. На Беларусі вельмі шырока выкарыстоўваецца сіне-блакітны колер на поўдні, гэта перадусім цэрквы праваслаўныя. А па ўсёй астатняй Беларусі паступова гэтыя колеры пачынаюць выцясняць белы з акон. Яны перастаюць быць белымі, усё часцей можна сустрэць гэты сіне-блакітны колеры. Ён зрабіўся таксама досыць распаўсюджаным колерам на могілках – агароджа, крыжы. Я думаю, што гэта таксама ўплыў праваслаўнай царквы. На маю думку, абсалютна дзіўна. Калі царква блакітная, я яшчэ магу зразумець. Кожны можа зразумець што сіні колер гэта колер неба. Зрэшты, гэта колер ў сярэднявеччы Дзевы Марыі і гэта адзін з кананічных колераў абразоў. Але калі крыжы і агароджа на могілках фарбуецца блакітам гэта абсалютна ірацыянальны падыход, насуперак.

Калі мы ўжо пры Беласточчыне, тады мне трэба запытаць што дызайнар са сталіцы робіць на правінцыі, у Бельску. Што тут цікавага?

– Па-першае мне не падабаецца слова правінцыя. Беларусь не такая вялікая краіна, каб мець яшчэ нейкую правінцыю. Яна ўмешчваецца ў свае гістарычныя рэгіёны. Лагічна і нармальна гэта Палессе, Падняпроў’е, Паазер’е, Нёманскі край і Падляшша. Кожны рэгіён для мяне гэта кавалак Беларусі, з якога складаецца.

А Смаленшчына – ужо не беларуская?

– Я быў у Смаленску ў мінулым годзе. На жаль, яна ўжо не беларуская. Увогле Смаленшчына гэта тэрыторыя з трагічнай гісторыяй. У прынцыпе гэта тая мадэль, якая магла спраўдзіцца на ўсю Беларусь, якая магла стаць Смаленшчынай. З іншымі гістарычнымі каранямі, іншымі сярэднявечнымі традыцыямі, магдэбургскім правам і г.д., пазней апынуцца ў складзе Расіі і стаць расійскім фарпостам на заходняй мяжы. Смаленшчына – вельмі трагічная гісторыя, памежная пазіцыя, знаходжанне. У прынцыпе там не толькі расійцы рабавалі і знішчалі, мы таксама. Тыя ж самыя палачане нападалі на Смаленск. Захоплівалі і забівалі палову насельніцтва.

Гэта было ў ранніх вяках, калі былі княствы. Вядома, гэта другое княства, Смаленскае.

– Ды яны, смаляне, таксама крывічы як і палачане. У крывічоў былі два цэнтры – Полацак і Смаленск. Адзін кантраляваў шлях з варагаў у грэкі, а другі іншы варыянт, праз які можна было дабрацца са Скандынавіі ў Візантыю. І на гэтых стратэгічных месцах узніклі гэтыя буйныя гарады. Ды яны былі з аднаго племяннога саюза. Крывічы полацкія напаўшы на Смаленск і захапіўшы яго, пазабівалі сваіх жа. Тое яшчэ раз пацвярджае тэзу, што ўтварэнне княстваў з якіх пазней ўтвараліся этнасы ці протаэтнасы, там, відаць, этнічны чыннік быў няважны. Больш важным было дынастычнае падпарадкаванне.

(працяг будзе)

Гутарыў **Тамаш Суліма**



Сустрэчы, прэзентацыі

Na Uschod



Maciej Szajkowski, muzyk „Kapeli Ze Wsi Warszawa", wcześniej również Village Kollektiv czy Masala, wraz ze swoim projektem R.U.T.A. (czyli Ruch Utopii, Transcendencji, Anarchii aka Reakcyjna Unia Terrorystyczno-Artystowska) zabiera nas w kolejną podróż muzyczno-etnograficzną. Na pierwszej płycie „Gore – Pieśni buntu i niedoli XVI-XX wieku" (2011) odbiorca otrzymał pokaźną dawkę pieśni wyrażających sprzeciw wobec feudalnego wyzysku ze strony polskich panów.


Karot Komando (karot.pl)

Podczas sesji nagraniowej

Tym razem zespół Szaji Bisurmana (taki przyjął pseudonim na potrzeby tego projektu Szajkowski) wysyła nas w podróż na wschód i prezentuje materiał pochodzących z kresów dawnej Rzeczpospolitej, nie mniej buntowniczy, niż na poprzedniej płycie. Duża część tekstów śpiewanych jest po białorusku i dotyczy stosunków panujących między chłopską ludnością a ich „lechickimi" panami. Oprócz tego płyta dotyka polskich Białorusinów w sposób namacalny, bo czy bohaterowie tych pieśni nie mogli być naszymi pradziadami, którzy brali baty z racji swego statusu społecznego jak i „heretyckiej" wiary? Jest to tak naprawdę pytanie retoryczne.

Płyta składa się z trzynastu utworów, w tym jednego coveru legendy radzieckiego rocka, zespołu „Kino". Białoruską muzykę ludyczno-ludowo-folkową reprezentują takie pieśni jak: „Sadoma" (zapisana w 1869 roku w ówczesnej guberni mińskiej), „Batracka Dola" (obwód miński,1938), „Drobna Drabnica" (rejon Mińska, 1960) czy „Oj Wasylu, Wasylu" (obwód brzeski, 1965). Powiedzmy sobie szczerze: ta muzyka żyje i porywa, a kilkakrotne przesłuchanie dysku sprawia, że teksty zostają w pamięci i można je zanucić. Mariaż folku z punkowymi aranżacjami po raz kolejny wyszedł zespołowi idealnie. Wszystko na tej płycie, liryka jak i muzyka, zazębia się, tworząc całość, wobec której nie można przejść obojętnie.

Wokaliści wczuwają się w teksty i potrafią zanurzyć się również w klimat kompozycji zebranych na płycie. W albumie usłyszymy ponownie głos Pawła Gumoli, zwanego po prostu Gumą (wokalista punkowej polskiej legendy „Moskwa"), Roberta Matery czyli Robala (kolejny weteran sceny z „Dezertera"), czy wreszcie młodą perspektywiczną białoruską wokalistkę Nastę Niakrasawą, której wokaliz słucha się z nieskrywaną radością.

Ale samym śpiewem człowiek nie żyje, ta płyta to również niesamowici instrumentaliści, którzy podczas nagrywania płyt korzystali z archaicznych instrumentów, jak fidel płocka, suka biłgorajska czy baraban. Oprócz tych instrumentów zespół korzystał podczas nagrywania materiału również ze skrzypiec, saksofonu sopranowego, klarnetu basowego czy gitary basowej, która jest instrumentem wybitnie współczesnym.

Na płycie nie mogło zabraknąć również gości w postaci ukraińskiego zespołu Hulajhorod czy węgierskich szamanek z HaLuna Music Group. Która z kompozycji zawarta na płycie prezentuje się najbardziej interesująco? Na pewno singlowe (powstały do nich teledyski) „Batracka Dola" i „*Ius primae noctis* – Prawo pierwszej nocy". Warta uwagi jest „Drobna drabnica" z kapitalnym punkowym w swojej wymowie tekstem , no i oczywiście cover zespołu Kino „Mama

– Anarchija”, którego na pewno nie powstydziłby się sam Wiktor Coj (nieżyjący lider formacji). Od pierwszych taktów słychać tam wybitnie uliczny i miejski charakter utworu. Odnaleźć można tu echa ska, a z drugiej strony street punk rocka, ale zagranego na ludowym instrumentarium z pomocą dziecięcego chóru.

„Na Uschod. Wolność albo śmierć” to nie tylko płyta z muzyką, ale i materiał etnograficzny zawarty w książeczce, o której napisałem powyżej, ale drugi to materiał etnograficzny w postaci książkowej wkładki, w którą zapakowana jest płyta. Książka zawiera materiał literacki, który współgra z muzyką zawartą na dysku. Oszczędna, czarna okładka, z niewielką domieszką bieli, już dowodzi, że mamy do czynienia z muzyką nastawioną jednoznacznie anarchistyczno – rewolucyjnie (takie właśnie były sztandary Nestora Machny, o którym za chwilę). W książce znajdują się eseje Jacka Podsiadło, w których rozlicza się z głęboko zakorzenioną w polskim społeczeństwie martyrologiczno-narodowym obrazem kresów, na których niby panowała sielska atmosfera, co jest nie prawdą, a gwałt i mord na elemencie chłopskim, w tym czasie nazywanym chamskim był na porządku dziennym i tolerowany ze wszech miar.

Interesujący jest również esej francuskiego profesora Daniela Beauvios’a. W swoim tekście pokazuje następstwa polskiej polityki wobec ludności ukraińskiej. W książce nie mogło zabraknąć również wyżej wspominanego Nestora Machno, z którą to postacią – jak twierdzi autor eseju Stanisław Lubieński – w swojej podróży na wschód R.U.T.A. musiała się spotkać, Nestor mógłby być dla nich nieodłącznym kompanem czy wręcz przewodnikiem.

Ostatni esej, „Dzieci Anarchii”, jest ze wszech miar współczesny i dotyczy anarchistycznych, opozycyjnych grup działających na Białorusi, Ukrainie czy Rosji, więc nie mogło w nim zabraknąć jak, że aktualnego tematu Pussy Riot. Za esej odpowiada białoruska opozycjonistka Sania, a tekst przetłumaczył Jacek Podsiadło. Tak więc w formie literackiej jak i muzycznej na płycie dzieje się co nie miara.

Nie da się nie zauważyć, że kwestie podjęte na płycie dla niektórych mogą być zbyt radykalne i wielu ich nie zaakceptuje, lecz ile można karmić się obłudnością i wierzyć w bajki. Czy nie lepiej z podniesioną głową przyjąć historię taka jak była? Choć teksty zawarte na płycie są archaiczne i pochodzą często sprzed ponad trzystu lat, nadal są w swojej wymowie aktualne. Widać to nawet na przykładzie wyżej wspominanego zespołu Pussy Riot.

Warto kupić tę płytę. Jest to nie tylko rozrywka w ładnym opakowaniu, ale również lekcja historii, atrakcyjna dla młodszych, bo nie zamkniętą w podręczniku, lecz w dźwiękach ethno hc punka, który może prościej uzmysłowić, z jakim przeciwnościami losu musieli zmagać się ich przodkowie.

Michał Iwaniuk

R.U.T.A. – Na Uschod. Wolność albo śmierć (2012). Wydawnictwo Karrot Komando. ■

Komentarz

Muzyka zaangażowana ideowo często staje się forpocztą świata polityki. Świetnym tego przykładem jest najnowszy album zespołu R.U.T.A., którego ideowym przekazem jest… anarchizujący marksizm (nie bójmy się tego słowa!). Walka klas, materializm dialektyczny, światowa rewolucja zaprowadzająca nowy ład – hasła, których doszukamy się na albumie, znamy już od dawna. Utwory na płytę zostały dobrane arbitralnie, według wizji świata ich ideowych spadkobierców. Charakteryzacji uległa również muzyka, gdzie punkowcy porzucają gitary na rzecz instrumentów ludowych. Pod tą artystyczną maską odnajdziemy twarze zaangażowane w światopogląd anarchistyczno-lewicowy. Proletariackiej gwiazdy na okładce albumu nie mogło zatem zabraknąć. Jaką rolę w tej kompozycji zajmuje białoruski chłop? Jest taranem wyważającym bramę w rękach nowej rewolucji obyczajowej pod znakiem piłujących krzyże aktywistek Femen i performerek z Pussy Riot. W sumie nic nowego, zawsze byliśmy traktowani instrumentalnie. (**ts**)

My nie pany. My chamy!

Na nowej płycie „R.U.T.A. Na Uschod” śpiewacie pieśni chłopskiego buntu z Białorusi i Ukrainy. Skąd pomysł na tę wschodnią wyprawę?

– W zeszłym roku występowaliśmy z R.U.T.A. na festiwalu białoruskiej muzyki alternatywnej Basowiszcza w Gródku. Igor Znyk, który jest znawcą białoruskiej sceny muzycznej, zasugerował, żebyśmy zagrali na koncercie kilka białoruskich kawałków. Białoruska wokalistka Nasta Niakrasava pomogła nam je wybrać. Na koncercie stało się coś niesamowitego. Kiedy Nasta zaczęła śpiewać: "Oj sadoma, sadoma, panie bracie, nie ma chleba w polu ani doma", zapadła totalna cisza, wszystko zamarło. Gdy wyśpiewała ostatnią nutę, wybuchł prawdziwy wulkan, ludzie zaczęli skandować - R.U.T.A.

Odczytali pieśń chłopskiego buntu jako protest przeciw dyktaturze.

– Tak. Uświadomiliśmy sobie wtedy, że ładunek energetyczny tych pieśni jest ogromny, że są potrzebne dzisiaj ludziom na Wschodzie. Nadszedł taki czas, że należy im wysyłać takie wolnościowe sygnały.

Gdybyśmy nie wierzyli w potencjał kultury buntu, nie robilibyśmy tych projektów. Historia XX wieku pokazuje, że kultura ma bardzo poważną siłę rażenia. Myślę np. o pokoleniu beatników: kilku muzyków i poetów dokonało poważnej transformacji umysłów na świecie.

Jest szansa na taką transformację na Wschodzie?

– Mam nadzieję. Dlatego wychodzimy poza czysto folkowe i punkowe środowiska, pokazujemy, że możemy spotkać się w słusznej sprawie z muzykami z Ukrainy i Białorusi. Nie mam złudzeń, że nagle zespół z Warszawy coś zmieni. Ale skoro opozycyjni politycy w tamtych krajach przegrywają z dyktaturą i autorytaryzmem, może impuls do zmian da kultura. To nasz obowiązek.

Istniała w przeszłości tradycja didów, wędrownych muzyków, którzy grając na lirze czy fideli przekazywali w pieśniach informacje o tym, co dzieje się na świecie. Słuchały ich całe wioski. Skoro już poznaliśmy historie, opisywane w pieśniach buntu, musimy przekazać je dalej.

Polska przez stulecia kolonizowała Ukrainę i Białoruś, na konflikt klasowy między panami i chamami nakładał się tam drugi konflikt: narodowościowy i religijny. Czy to nie stanowiło przeszkody w waszej pracy?

– Nie, przeciwnie. Odkryliśmy, że mimo podziałów historycznych potrafimy być razem, Ukraińcy, Białorusini i Polacy, bez tych wszystkich roszczeń, resentymentów, że ci kaci, a ci ofiary, że tu zabrali, a tu wyrżnęli. Pamiętamy o historii, mamy jej świadomość, ale jeśli wciąż będziemy licytować się, kto był większym barbarzyńcą, kto boleśniej to odczuł, to nigdy się nie porozumiemy. Na początku płyty pojawia się taka żartobliwa sekwencja: muzycy z Hulajhorodu pytają: „Kto wy", Polacy odpowiadają: „Lachy". Oni: „My znajem Lachy, oni usi pany" – wszyscy są panami. A my na to: „My nie pany. My chamy!".

Dogadujecie się jak cham z chamem?

– Czyli jak człowiek z człowiekiem. Trzeba pamiętać, że określenie cham nie zawsze brzmiało obelżywie, zwłaszcza z perspektywy chłopskiej. Chłop nie miał świadomości, że pan nazywając go chamem, ubliża mu. To słowo nabrało pejoratywnego znaczenia później. Chcemy zejść z tej drogi odwiecznego konfliktu. Chodzi o powiedzenie skrywanej, albo przekłamywanej prawdy. I o zrozumienie dzisiejszych podziałów. Jakub Bojko, jeden z pionierów ruchu ludowego w Galicji, napisał, że 400 lat tej macochy, wrednej matki, jaką była pańszczyzna, będzie się kładło piętnem jeszcze długo na życiu kolejnych pokoleń Polaków. To fatum, które nad nami wisi. Może R.U.T.A. je zdejmie.

Z rozmowy z Maciejem Szajkowskim, liderem zespołu R.U.T.A., w „Gazecie Wyborczej", 11 sierpnia 2012

Папраўка

У папярэднім нумары на стар. 10-й у інфармацыі пра перадачы для палякаў у Беларусі, якія з 14-га ліпеня ўвяло ў свой эфір Радыё Рацыя, была дапушчана памылка. Гражына Шалкевіч, якая рыхтуе гэтыя перадачы, не з'яўляецца дачкой вядомага беларускага барда Віктара Шалкевіча, толькі яго сваячкай. Просім прабачэння. (**рэд.**)

Радкі з лістоў, адгалоскі

Паездка – як сон

У Часопісе н-р 9/2012; с.19 з'явілася занатоўка пра паездку беластоцкай моладзі ў Нью-Йорк. Ёсць у гэтым кароткім тэксце некалькі няпраўдзівых інфармацыяў, на якія хачу звярнуць увагу.

Два гады працы над падрыхтоўкай спектакля „Ой даўно, даўно... Беларускія гісторыі з Падляшша", потым больш 1,5 года прэзентацыяў у розных кутках Беласточчыны, працавітыя суботы, занятыя нядзелі. Як сцвярджаюць дасведчаныя тэатралы мастацкі ўзровень і моц сцэнічнага слова ў спектаклі на самым высокім узроўні. Моладзь, якая ўзялася за гэтую справу напэўна вартая пахвалы і ўсялякай узнагароды. Тым не менш, ніхто з дзесятка вучняў, якія ўдзельнічаюць у праекце, не рабіў гэтага для ўзнагароды, а з патрэбы сэрца. Тое ж самае тычыцца іх апекуноў.

У Амерыку мы паехалі на запрашэнне людзей, якія жывуць беларускай справай, якія звыш 15 гадоў з цікаўнасцю сачылі за развіццём беларускага школьніцтва ў Беластоку, за праектам «Падляшскія хронікі», чыталі нашу кнігу і былі зацікаўленыя ўбачыць п'есу сваімі вачыма. У Амерыку паехалі не „беларуская моладзь з Беластока і бацькі" (на жаль, мы яшчэ не арганізуем экскурсіяў для „вучняў і бацькоў" у Нью-Йорк), а дакладна ўдзельнікі праекта «Падляшскія хронікі», настаўніца беларускай мовы, апякунка праекта і рэжысёр спектакля Аліны Ваўранюк, ды ніжэй падпісаная арганізатарка паездкі.

Лічу таксама неадэкватным супастаўленне нашага выезду ў ЗША з паездкамі ў Беларусь для лаўрэатаў алімпіяды па беларускай мове, ладжанымі з дапамогай афіцыйных устаноў Рэспублікі Беларусь. Зрэшты, як мне вядома (я маці дзвюх лаўрэатак гэтай алімпіяды), у апошнія гады ніякіх паездак не было. (...)

***Барбара Пякарска** – старшыня Аб'яднання ў карысць дзяцей і моладзі, якія вывучаюць беларускую мову АБ-БА*



Nowe nagrobki nie określają naszej tożsamości. Nie określają też żadnej kulturowej tożsamości. Wybiera się je z katalogów, sądząc, że są jakieś różnice w projektach i że zabłyśniemy różnicą. Nie ma otóż różnicy. Detale tych ujednoliconych bezkulturowych „willi cmentarnych” mają je różnić – a to inny kształt ma oparcie tego łóżka, a to ornament jest inny. Niestety, katalog to katalog. Nic tam nie ma poza sztampą. Ilość wzorów, motywów roślinnych, kształtów tablic jest ograniczona nie...



1 чэрвеня прайшоў IX з’езд БГКТ. БГКТ мела тады 5871 членаў. З’езд звяртаў увагу на пашырэнне колькасці членаў і гурткоў БГКТ, на пашырэнне конкурсу „Беларуская песня” і на разбуджэнне большай самастойнасці. З’езд выбраў старшынёю БГКТ Мікалая Самоціка, намеснікам старшыні Георгія Валкавыцкага і сакратаром Янку Зенюка. Мікалай Самоцік не дачакаў да X з’езда БГКТ у 1984 г., бо памёр... (dalej w kolejnych numerach

Czasopis

Nr indeksu 355038, ISSN 1230-1876.
Wydawca: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich.
Adres redakcji:
Białystok, ul. Lipowa 4/221.
Adres do korespondencji:
„Czasopis”, 15-001 Białystok, skr. p. 262. **E-mail**: redakcja@czasopis.pl
http://czasopis.pl
Tel. (85) 653 79 66

Redaktor naczelny: Jerzy Chmielewski, tel. 502 661 316.
Zespół redakcyjny: Wiesław Choruży, Helena Kozłowska-Głogowska, Sławomir Iwaniuk, Tomasz Sulima (sekretarz redakcji), Jerzy Sulżyk.
Stali współpracownicy: Piotr Bajko (Białowieża), Tamara Bołdak-Janowska (Olsztyn), Agnieszka Goral (Lublin), Mirosława Łuksza, Janusz Korbel (Białowieża), Aleksander Maksymiuk, Jan Maksymiuk (Praga), Michał Mincewicz (Orla), Dorota Wysocka.
Druk: Orthdruk, Białystok.



Prenumerata: Odpowiednio do liczby zamawianych egzemplarzy i okresu prenumeraty należy wpłacić wielokrotność 4 zł na rachunek: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich: Bank PEKAO S.A. Białystok 30 1240 5211 1111 0000 4928 9343.
Беларускі грамадска-культурны часопіс, прысвечаны пытанням сучаснасці, гісторыі, літаратуры і мастацтва, месца чалавека ў свеце. Форум думкі беларусаў і ўсіх тых, каму блізкая беларуская тэматыка. Пазіцыі аўтараў тэкстаў не заўсёды адпавядаюць пазіцыям рэдакцыі. Не публікуюцца матэрыялы, якія прапагандуюць камуна-фашызм, расізм, нацыянальную варожасць.
Artykuły i listy publikowane są – o ile autor nie życzy sobie inaczej – w języku oryginału: po polsku lub białorusku. Redakcja zastrzega sobie prawo do skrótów, zmian tytułów i redagowania nadesłanych tekstów.

Materiałów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Administracji i Cyfryzacji.

Numer złożono 25 września 2012.

БАРДАЎСКАЯ ВОСЕНЬ 2012

ЗЬВЯЗ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Як кожны год, разам з надыходам восені, набліжаецца Фестываль “Бардаўская восень!”

Бардаўскія песні, заангажаваныя тэксты, але таксама сатырычны погляд на рэчаіснасць – гэта будзе можна пачуць у час Фестывалю беларускай бардаўскай ды аўтарскай песні “Бардаўская Восень 2012”.

Сёлета фестываль будзе арганізаваны ў 19 раз.

Безупынна гэта найбольшы, не толькі ў Еўропе, але і ва ўсім свеце, фестываль, на якім выступаюць беларускія барды.

Як кожны год, і ў гэты раз выступяць зоркі беларускай сцэны, а сярод іх Лявон Вольскі, Зьміцер Вайцюшкевіч і W-Z Orkiestra, Віктар Шалкевіч. На сцэне хопіць таксама месца для выканаўцаў, якія сваіх поспехаў дасягнулі між іншымі таксама дзякуючы ўдзелу ў конкурснай частцы “Бардаўскай восені” - Bosamu Soncu, ILO & Friends, Паліне Рэспубліцы ці Алегу Кабзару. Не абыдзецца і без музычных прэм’ераў. Хопіць успомніць першы ў Польшчы канцэрт гурта HandmadE.

Сёлетні выпуск “Бардаўскай восені” пачне конкурсная частка (26 кастрычніка). Гэты ж конкурс не адзін раз быў месцам дэбюту многіх цікавых беларускіх музыкаў, у тым ліку: Паліны Рэспублікі, Яўгена Барышнікава, Дарыі Кадамскай ці гуртоў Alta Mente, Re1ikt, Bosae Sonca.

БАРДАЎСКАЯ ВОСЕНЬ 2012

26-28 кастрычніка 2012

Канцэрты ў рамках Фестывалю “Бардаўская восень”, апрача Бельскага дома культуры пройдуць у Цэнтры адукацыі і прамоцыі беларускай культуры ў Шчытах-Дзенцялове, Гмінным цэнтры культуры ў Гарадку, Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы ды Дубічах-Царкоўных. У нядзелю (28 кастрычніка) запрашаем у новы будынак Падляшскай оперы і філармоніі ў Беластоку. На ўсе канцэрты ўступ бясплатны.

Дэталёвую праграму “Бардаўскай восені” ды справаздачы з папярэдніх выпускаў фестывалю можна глядзець на **www.vosien.org**.

Festiwal organizowany jest przy wsparciu finansowym Ministra Administracji i Cyfryzacji, Miasta Białegostoku (Urząd Miejski w Białymstoku) oraz Urzędu Marszałkowskiego Województwa Podlaskiego w Białymstoku.